

# «НАМ НЕ ПАТРЭБНА РЭФОРМА ДЗЕЛЯ РЭФОРМЫ»

**На нарадзе ў Палацы Незалежнасці абмяркоўвалі паляпшэнне сітуацыі на адным з вядучых прадпрыемстваў і ўдасканаленне дзейнасці сферы турызму**

(Стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

19 ЖНІЎНЯ 2025 г. АЎТОРАК № 158 (30546)

# ЁСЦЬ СЁМЫ МІЛЬЁН!



Паводле аператыўных даных на 18 жніўня, на палях краіны намалочана 7 мільёнаў 213 тысяч тон збожжа разам з рапсам. Збожжавыя і зернебабовыя культуры без кукурузы ўбраны з 76 працэнтаў плошчаў, што складае 1523 тысячы га. Сярэдняя ўраджайнасць збожжа вышэйшая за леташнюю на 8,5 ц/га.

Пастаўлена ў лік дзяржзаказу: харчовага збожжа — 376 тысяч тон (54 працэнты ад плана), алейнага семя рапсу — 95 тысяч тон (99 працэнтаў ад плана).

Пасеяна азімага рапсу на зерне на плошчы 219 тысяч га, або 50 працэнтаў запланаванага.

Нарыхтавана сена 360 тысяч тон (50 працэнтаў плана), сенажу — 11 мільёнаў 861 тысяча тон (85 працэнтаў плана), у тым ліку ў палімернай упакоўцы — 386 тысяч тон. Травяных кармоў нарыхтавана 3 мільёны 613 тысяч тон — 36 працэнтаў плана.

СТАР. 6–7

Фота БелТА.

БЫВАЙ ЖА, ЛЕЦЕЙКА, БЫВАЙ!



16

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

25158

РЭГІЯНАЛЬНЫ БРЭНД

## МІР ПАХНЕ ХЛЕБАМ

**Чым сёлета быў адметны каравай-фэст «Бацькава булка»**

Самы малады фестываль Беларусі ў чацвёрты раз сабраў гасцей з усёй краіны! Нягледзячы на тое, што пачаў праводзіцца параўнальна нядаўна, ён ужо вядомы далёка за межамі горада Свіслач Гродзенскай вобласці і паспеў палюбіцца многім. Першы фестываль адбыўся па прапанове Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі пасля візіту на мясцовую пякарню ў 2021 годзе. Ужо тады стала зразумела, што свята будзе традыцыйным.

СТАР. 8–9



# «НАМ НЕ ПАТРЭБНА РЭФОРМА

**На нарадзе ў Палацы Незалежнасці абмяркоўвалі паляпшэнне сітуацыі на адным**

Практыка калегіяльнага абмеркавання асабліва важных і вострых тэм, якія арыентаваны на прыняцце рашэнняў кіраўніка дзяржавы, працягваецца. У панядзелак Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сабраў нараду з кіраўніцтвам Савета Міністраў па двух пытаннях, па якіх хацеў бы параіцца.



Фота БелТА.

## АД ПРАКТЫКІ «ПАДТРЫМАННЯ ШТАНОЎ» ТРЭБА ПАЗБАЎЛЯЦЦА

Адным з пытанняў, вынесеных на парадак дня нарады Прэзідэнта з кіраўніцтвам урада стаў праект указа аб забеспячэнні ўстойлівай работы холдынга «АМКАДОР». Гэту праблему кіраўнік дзяржавы назваў найважнейшай. Ён адзначыў, што на сёння холдынг з амаль векавой гісторыяй (першы завод быў пабудаваны ў 1927 годзе) з'яўляецца найбуйнейшым вытворцам дарожна-будаўнічай, лясной і сельскагаспадарчай тэхнікі ў Беларусі і ў краінах СНД.

**«Найважнейшы і найкаштоўнейшы завод. Ад якасці тэхнікі залежаць хуткасць уборкі бураломаў, будаўніцтва дарог і элементарная чысціня на вуліцах, ды і наяўнасць хлеба ў засеках, — акцэнтаваў кіраўнік дзяржавы.**

— Прычым лінейка прадукцыі ў «АМКАДОРа» пастаянна пашыраецца. За апошнія гады створана нямала навінак. Гэта пагоня за разнастайнасцю, магчыма, і стала адной з прычын складанай фінансавай сітуацыі. Магчыма, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

**— Паколькі ранейшыя ўладальнікі холдынга сумленна прызналі, што больш не могуць забяспечваць вяртанне запазычаных сродкаў (гэта значыць, прызналі, што даўгі ўзялі, а вярнуць не могуць), было вырашана прыняць кіравальную кампанію ва ўласнасць дзяржавы. Мы ж не можам калектыў кінуць — гэта ж тысячы людзей. І самае галоўнае, што прадукцыя гэта нам патрэбна».**

Па даручэнні Прэзідэнта было распрацавана комплекснае рашэнне па фінансавым аздараўленні «АМКАДОРа». Асноўныя ўмовы простыя: захаваць вытворчасць, не страціць напрацаваныя кампетэнцыі і, галоўнае, абараніць працоўны калектыў. «Людзі ні ў чым не вінаватыя, тым больш людзі моцныя, адукаваныя», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў, што чарговы раз «перахопліваць» грошы, а потым казаць пра тое, што іх немагчыма вярнуць, — не атрымаецца.

**«Цяпер, дарэчы, не час нам распыляцца, спрабуючы за адзін раз задаволіць запыты ўсіх спажыўцоў. Трэба забяспечыць вытворчасць самых запатрабаваных і, адпаведна, буйнасерыйных мадэляў тэхнікі, якасць іх забяспечыць трэба і канкурэнтаздоль-**

## Даслоўна

### ВЫЗНАЧАНЫ НОВЫ РЭГУЛЯТАР СФЕРЫ ТУРЫЗМУ



Кіраўнік дзяржавы падтрымаў ініцыятывы ўрада па ўдасканаленні рэгулявання сферы турызму, але з персанальнай адказнасцю за дасягненне выніку. Пра гэта расказаў журналістам па выніках нарады **першы намеснік Прэм'ер-міністра Мікалай СНАПКОЎ**.

«Мы плануем да 2030 года павялічыць удзельную вагу гэтай галіны ў ВУП да 4 % са штогадовым адсочваннем выніку і персанальнай адказнасцю за штогадовае атрыманне выніку. Гэта значыць, паступальны рост гэтай галіны і паступальны рост яе ўкладу ў ВУП, — адзначыў ён. — Механізм выканання задачы, якую паставіў перад сабой урад і на якой сёння акцэнтаваў увагу Прэзідэнт, — гэта вертыкаль і ўзаемадзеянне з бізнесам».

Па словах першага віцэ-прэм'ера, усе пытанні будуць вырашацца комплексна, паколькі турызм вельмі цесна звязаны з іншымі галінамі эканомікі. Турызм шматгранны, і гэта трэба ўлічваць. Напрыклад, па словах Мікалая Снапкова, кітайскім гасцям цікавы дэтокс-турызм, расійскі турыст едзе ў Беларусь за цішынёй і адзінотай. «І трэба гэтыя кірункі «лавіць». А каб іх «лавіць», мы павінны забяспечваць узаемадзеянне з бізнесам, які працуе на рынку, і хутка фарміраваць адпаведныя ўмовы, каб развіваць кірункі турызму, якія цяпер знаходзяцца на піку», — патлумачыў першы намеснік Прэм'ер-міністра. Пры гэтым традыцыйныя галіны, турыстычная інфраструктура павінны не губляць якасці аказання паслуг.

Паўнацэннае і комплекснае вырашэнне шматлікіх пытанняў турыстычнай галіны, узаемадзеянне ўсіх адказных, у тым ліку і мясцовай улады — гэта і ёсць зона адказнасці новага рэгулятара — Нацыянальнага агенцтва па турызме. І, як акцэнтаваў Мікалай Снапкоў, гэта будзе яшчэ і бізнес-рэгулятар, які будзе фарміраваць і прапаноўваць турыстычныя кірункі.

### САМАЕ ГАЛОЎНАЕ — МАБІЛІЗАВАЦЬ РЭСУРСЫ «АМКАДОРА»

**Намеснік Прэм'ер-міністра Віктар КАРАНКЕВІЧ** расказаў, што праект указа, які забяспечвае комплекснае рашэнне па фінансавым аздараўленні прадпрыемстваў холдынга «АМКАДОР», канцэптуальна падтрыманы, але з аператыўнай дапрацоўкай асобных палажэнняў.

«Асноўныя кірункі, прадугледжаныя ўказам, — гэта рэструктурызацыя даўгавых абавязацельстваў з мэтай іх далейшага эфектыўнага выкарыстання ў частцы павелічэння аб'ёмаў вытворчасці, збалансаванасці фінансавых патокаў і кіравання гэтымі даўгавымі абавязацельствамі ў будучым. Маецца на ўвазе таксама рэалізацыя інвестыцыйных праектаў, якія знаходзяцца ў высокай ступені гатоўнасці, — гэта імпартазамяшчальныя праекты, якія павінны даць аддачу ўжо з 2026 года», — расказаў Віктар Каранкевіч.



Паводле яго слоў, тэхніка «АМКАДОРа» запатрабаваная пастаянна, і не толькі на беларускім, але і на расійскім рынках. «Самае галоўнае — мабілізаваць рэсурсы прадпрыемства, накіраваныя на выпуск гэтай тэхнікі для выканання кантрактаў, якія ўжо заключаны. І задача нязменная — працаваць як на ўнутраным рынку, так і на асноўных рынках за межамі Беларусі. Тэхніка запатрабаваная, таму трэба нарасціць аб'ёмы вытворчасці. Выйсці на аб'ёмы, якія забяспечваюць збалансаванасць фінансавых патокаў, прыбытковую работу прадпрыемства.

# ДЗЕЛЯ РЭФОРМЫ»

## з вядучых прадпрыемстваў і ўдасканаленне дзейнасці сферы турызму

**насць. Калі вы зможаце выпускаць касмічныя ракеты — калі ласка, толькі за свой кошт.**

Каб не залежаць ад еўрапейскіх пастаўшчыкоў камплектуючых, патрэбныя ўласныя распрацоўкі і рост лакалізацыі. Імкнуцца трэба да 100 працэнтаў, каб усё выраблялі самі, у крайнім выпадку з расіянамі», — арыентуе Прэзідэнт.

Урадам падрыхтаваны праект указа, які забяспечвае вырашэнне крызіснай сітуацыі ў холдынгу «АМКАДОР». Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, што дасць гэты ўказ.

**«Я ўжо неаднаразова адзначаў: ад практыкі «падтрымання штаноў» трэба пазбаўляцца. Бюджэтныя грошы — грошы народныя. У нас ёсць шмат куды ўкладваць гэтыя грошы», — нагадаў кіраўнік дзяржавы.**

Беларускі лідар удакладніў, што зроблена ўрадам і новым кіраўніцтвам «АМКАДОРа» на сваім узроўні, ці ёсць станоўчыя якасныя змены.

### ТУРЫЗМ — НАЦЫЯНАЛЬНЫ ПРАЕКТ

Яшчэ адно пытанне нарады — рэфармаванне сферы турызму. Саветам Міністраў падрыхтаваны праект указа, які прадугледжвае перадачу функцый рэгулятара ў турыстычнай сферы ад Міністэрства спорту Нацыянальнаму агенцтву па турызме, якое прапануецца перападпарадкаваць наўпрост ураду. «Калі так, папрошу кажучы, стварыць новае падабенства Міністэрства пры ўрадзе», — удакладніў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ўказ яшчэ не падпісаны, таму ён запрасіў кіраўніцтва Савета Міністраў, каб атрымаць канкрэтныя адказы на шэраг пытанняў. «Першае пытанне — што цяпер перашкаджае дзейнаму рэгулятару эфектыўна кіраваць галіной і што зменіцца з прыняццем указа? Наогул, адкуль усё гэта пайшло і навошта ўсё гэта трэба? Які будзе вынік?» — пацікавіўся кіраўнік дзяржавы. Ён таксама спытаў, які практычны механізм рэалізацыі заяўленых мэт: як і за кошт чаго айчынны турызм атрымае новы імпульс для развіцця?

**«Нагадаю, на наступную пяцігодку ўраду пастаўлена задача зрабіць турызм нацыянальным праектам, рэалізаваць яго эканамічны патэнцыял па максімуме. Беларусь, мы гэта ведаем, вельмі цікавая краіна для турыстаў», — падкрэсліў Прэзідэнт.**

Ён звярнуў увагу, што сённяназіраецца вялікая цікавасць да турыстычнага патэнцыялу нашай краіны. У гасцініцах няма свабодных месцаў, усё загружана. «Так, для таго каб пашыраць турыстычныя паслугі, прыток турыстаў, нам спатрэбіцца павышэнне якасці паслуг і дадатковае развіццё інфраструктуры, індустрыі гасцінасці.

**Груба скажу: калі ў гасцініцах па сценках і пад ложкамі будуць поўзаць прусакі, то ніякія турысты сюды не паедуць. Узровень патрэбны такі, каб і беларусы часцей выбіралі адпачынак на роднай зямлі.**

Я думаю, яны і выбіраюць», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт пацікавіўся, якіх канкрэтных эканамічных паказчыкаў урад плануе дасягнуць у галіне да канца пяцігодкі і на сярэднетэрміновую перспектыву. «Нельга забываць пра найважнейшы складнік — кадравае пытанне. Хто будзе рэалізоўваць вашы планы і праграмы? Як будзе наладжана ўзаемадзеянне з рэгіёнамі? Якая пазіцыя губернатараў па пытанні гэтай рэарганізацыі? — пазначыў яшчэ шэраг пытанняў беларускі лідар.

**— Паўтараю, нам не патрэбна рэформа дзеля рэформы. Стварэнне новай кіраўніцкай структуры ў сферы турызму не можа абмежавацца перайменаваннем і перападпарадкаваннем».**

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў: наспела неабходнасць кардынальных змяненняў форм і метадаў работы па развіцці турызму як унутры краіны, так і на знешніх рынках.

### НЕАБХОДНА ПАВЫСІЦЬ ДАХОДНАСЦЬ ТУРЫСТЫЧНАЙ СФЕРЫ

Аб усіх пытаннях далажыў першы намеснік Прэм'ер-міністра Мікалай Снапкоў. У сваім дакладзе ён адзначыў, што турызм — гэта эканоміка. Ён, як лакаматыў, цягне за сабой развіццё іншых сфер. «Турыстычнае спажыванне, як ніякая іншая галіна эканомікі, уключае ў сябе 55 відаў эканамічнай дзейнасці», — падкрэсліў першы віцэ-прэм'ер. Прэзідэнт з гэтым тэзісам пагадзіўся і прывёў паказальны прыклад: у эканоміцы Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў першае месца займае турызм.

Мікалай Снапкоў адзначыў, што ў Беларусі ў турызме занята 230 тысяч чалавек, гэта 5,5 % занятых на ўсёй эканоміцы нашай краіны. «Турызм забяспечвае каля 2 % ВУП, што не адпавядае яго патэнцыяльнаму ўзроўню і магчымасцям. Якасная структура турыстычнага патоку неспрыяльная. Па-першае, колькасць выязных тураў амаль у два разы перавышае колькасць уязных у Беларусь. Аб'ём вывезеных беларускімі турыстамі сродкаў у 12 разоў большы, чым аб'ём увезеных сюды замежнымі турыстамі. Наша задача — змяніць баланс, які склаўся, пакінуць больш валюты ў краіне», — далажыў першы віцэ-прэм'ер.

Для гэтага, па яго словах, трэба вырашыць дзве задачы. Першая — павялічыць працягласць знаходжання турыстаў. Другая — павялічыць сярэдні чэк, гэта значыць суму, якую пакідае турыст за час свайго падарожжа. У Беларусі на гэты момант дамінуюць кароткатэрміновыя паездкі як у нашых грамадзян, так і ў замежнікаў. «У выніку замежны турыст пакідае ў Беларусі ўсяго 125 долараў у сярэднім за суткі, беларускі турыст — 47», — прывёў лічбы Мікалай Снапкоў. Праз кароткатэрміновасць знаходжання даходы турызму меншыя, чым маглі б быць, таму мэта рэфармавання сферы — павысіць даходнасць турызму.

Мікалай Снапкоў расказаў пра механізм: «Часу на развaрушванне ў нас няма. Трэба хутка перафарматаваць галіну ў рэальную вертыкаль. З улікам статусу Нацыянальнага агенцтва па турызме і яго новых функцый — аб'яднаць намаганні дзяржавы і прыватнага бізнесу. Без удзелу прыватнага бізнесу гэту галіну не падняць. Сумесна трэба шукаць і стымуляваць пункты росту. Неабходна канцэнтрацыя ўсіх кіраўніцкіх рэсурсаў у адным цэнтры прыняцця рашэнняў, каб каардынаваць дзясяткі галін, забяспечваць экспартны рост і стымуляваць інвестыцыі ў гэтай сферы».



Фота БелТА.

Таму прапануецца стварыць цэласную сістэму кіравання турыстычнай галіны, аб'яднаць Дэпартамент па турызме і Нацыянальнае агенцтва па турызме ў адзіную структуру. Аб'яднаную структуру — Нацыянальнае агенцтва па турызме — прапануецца падпарадкаваць наўпрост Савету Міністраў.

---

і рухацца далей, пашыраючы наменклатуру, павялічваючы аб'ёмы вытворчасці. У развіццё ўказа будзе прынятая стратэгія развіцця прадпрыемства, якая будзе прадугледжваць эфектыўнасць работы холдынга», — адзначыў Віктар Каранкевіч.



**Аляксандр ЯФІМАЎ, генеральны дырэктар ААТ «АМКАДОР»** — кіруючай кампаніі холдынга, расказаў, што прадпрыемства нацэлена на павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці да 2030 года не менш чым у два разы. «Будзе працягнуты курс на пашырэнне наменклатуры прадукцыі. Кіраўнік дзяржавы заўсёды ставіць гэту задачу і сёння яшчэ раз падкрэсліў, што максімальная лакалізацыя павінна быць забяспечаная. Мы традыцыйна выкарыстоўваем у вытворчасці ўласную кампанентную базу, яна ў нас актыўна развіваецца, што дазволіла стабільна функцыянаваць у няпростых час пасля ўвядзення пэўных абмежаванняў. Курс у гэтым кірунку будзе працягнуты на пашырэнне лінейкі, але пры гэтым найбольш маржынальных відаў прадукцыі, лакалізоўваць іх будзем на нашых прадпрыемствах, якія выпускаюць кампанентную базу. Мы працягнем завяршэнне інвестыцыйных праектаў, у тым ліку імпартазамяшчальных, якія фінансуюцца Расійскай Федэрацыяй і накіраваныя на забеспячэнне рынкаў Беларусі і Расіі канчатковымі прадуктамі, і камплектуючымі», — адзначыў ён.

Кіраўнік кампаніі звярнуў увагу, што ў сучасным свеце на навейшых рынках вельмі складана ўтрымлівацца без пашырэння наменклатуры прадукцыі. І на кожны яе від ёсць свой кліент. «АМКАДОР» імкнецца заняць усе нішы. «Ключавое, што мы будзем ацэньваць, — маржынальнасць нашай прадукцыі і



максімальную прыбытковасць пры праектаванні і стварэнні вытворчасцяў. Мы сканцэнтруемся на самых эканамічна-навуковых тэмах у частцы пашырэння нашай наменклатуры. І, вядома, частка наменклатуры павінна замяняць ужо састарэлую прадукцыю. Без руху наперад не будзе развіцця прадпрыемства, але пры гэтым усё будзе выверана і ўзважана», — заявіў кіраўнік «АМКАДОРа».

Журналісты пацікавіліся, як холдынг будзе вытрымліваць вялікую канкурэнцыю. «Канкурэнцыя на самай справе сёння дастаткова сур'ёзная на ўсіх рынках збыту. І аптымальныя суадносіны сабекошту і якасці прадукцыі вызначаюць перавагу на той ці іншай рынкавай нішы. У гэтай частцы мы праводзім вялікую работу па аптымізацыі выдаткаў з мэтай зніжэння цаны нашых вырабаў для канчатковых спажыўцоў. І пры гэтым набліжаемся да тэхнічных патрабаванняў машын сусветнага ўзроўню. У сукупнасці гэтыя два падыходы прывядуць да таго, што мы не проста захаваемся, а паступова будзем павялічваць нашу долю прысутнасці ў першую чаргу на традыцыйным для нас экспартным рынку Расійскай Федэрацыі», — патлумачыў Аляксандр Яфімаў.

19 жніўня 2025 г. ЗВЯЗДА

# ДА МІРУ ПРАЗ

## «Беларусь, праводзячы шматвектарную палітыку, ніколі не падводзіла сваіх партнёраў»:

Сімвалічна і зусім невыпадкова, што падчас вялікіх перагавораў, якія датычацца не толькі лёсу Украіны, але і бяспекі на еўрапейскім кантыненце, а калі паглядзець глыбей, дык і на планеце ў цэлым, у цэнтры навін зноў гучаць Беларусь і імя яе лідара. Дзесяць гадоў назад Мінск стаў пляцоўкай, на якой кіраўнікі Расіі, Украіны, Германіі і Францыі шукалі выйсце з сітуацыі, якое б задаволіла ўсіх. Мінскія дамоўленасці сталі ўстойлівым выразам на доўгія гады, і, калі б «заходнія партнёры» і іхнія падапечныя ва Украіне іх выконвалі, не было б таго, што мы маем цяпер. Але нават тады, дзесяць гадоў назад, мудры палітык Лукашэнка, які ініцыяваў і арганізаваў сустрэчу ў Мінску, адзначаў: «Калі амерыканцы хочуць, каб тут быў мір і стабільнасць, яны неадкладна павінны далучыцца да гэтага працэсу».

Званок Прэзідэнта ЗША Дональда Трампа Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку непасрэдна з борта самалёта, на якім амерыканскі лідар накіроўваўся на Аляску на перагаворы з Уладзімірам Пуціным, стаў топавай навіной сусветных інфармагенцтваў нароўні з перагаворамі, якія павінны адбыцца. Літаральна ўслед за гэтым быў яшчэ адзін тэлефонны званок амерыканскага боку — Аляксандру Лукашэнку тэлефанаваў ужо прадстаўнік Прэзідэнта ЗША Джон Коўл. Зноў гаварылі пра тады яшчэ маючыя адбыцца перагаворы на Алясцы. Прэзідэнт Беларусі яшчэ раз (пасля размовы з Дональдам Трампам) выклаў свой пункт гледжання наконт сітуацыі ва Украіне.

Аб тым, што размова з ім будзе амерыканскаму прэзідэнту «архікарысная», Аляксандр Лукашэнка гаварыў у рэзанансным інтэрв'ю часопісу TIME. У тым жа інтэрв'ю, відэаверсія якога пасля выхаду набрала ўжо больш за 15 мільёнаў праглядаў, беларускі лідар яскрава патлумачыў у тым ліку і пазіцыю Уладзіміра Пуціна ва ўрэгуляванні сітуацыі вакол Украіны. Праз тыдзень пасля інтэрв'ю, незадоўга да перагавораў на Алясцы, была сустрэча лідараў Беларусі і Расіі на Валааме, дзе таксама абмяркоўваліся і перагаворы па Украіне. А назаўтра пасля ўласна перагавораў на Алясцы ў тэлефоннай размове расійскі лідар падрабязна праінфармаваў свайго беларускага калегу аб выніках саміту «Расія — ЗША».

Увесь гэты ланцужок даступнай шырокай публіцы інфармацыі (а вялікая палітыка робіцца звычайна не публічна) сведчыць пра тое, што Беларусь на сённяшні дзень вядучыя геапалітычныя гульцы разглядаюць як раўнапраўнага ўдзельніка планетарна важных працэсаў, а кіраўніка нашай краіны — як лідара, які іграе важную ролю ў перагаворных працэсах, у няпростым дыялогу Усходу і Захаду. Аб гэтым і ролі нашай краіны ў вялікай геапалітыцы — у меркаваннях нашых экспертаў.

### МОСТ ПАМІЖ ЗАХАДАМ І УСХОДАМ

Званок Прэзідэнта ЗША Дональда Трампа Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку перад пачаткам расійска-амерыканскага саміту на Алясцы сведчыць аб тым, што кіраўнік беларускай дзяржавы валодае аўтарытэтам узроўню лідараў сусветных дзяржаў. Пра гэта заявіў на прэс-канферэнцыі **старшыня Каардынацыйнага савета Еўразійскага інфармацыйна-аналітычнага кансорцыума, экс-генеральны сакратар АДКБ Мікалай БАРДЗЮЖА,** паведамляе БелТА.



— Я лічу, што адкрываюцца вочы ў многіх думаючых лідараў краін. І яны бачаць: проста за тое, што дзяржава мае сваю пазіцыю, абараняе свой суверэнітэт, яе нельга пастаянна падвяргаць санкцыям, палітычнаму ціску. І я думаю, што самы красамоўны прыклад — менавіта Беларусь. Беларусь падвяргалася каласальнай колькасці санкцый, не меншай колькасці, чым Расійская Федэрацыя.

> **У свой час усе палітолагі пісалі, што толькі Беларусь у свеце мае абсалютны суверэнітэт, калі менавіта толькі кіраўніцтва Беларусі прымае тыя рашэнні, якія выгадныя для свайго народа. І менавіта за гэта нашы заходнія калегі, Еўрасаюз увесь час спрабаваў ажыццяўляць палітычны і эканамічны ціск на Беларусь. Думаю, Трамп убачыў рэальнае становішча спраў, што Беларусь сёння квітнеючая дзяржава, — сказаў Мікалай Бардзюжа.**

Ён выказаў меркаванне, што гэтыя дзеянні Трампа, у тым ліку ўвага да невялікай краіны, Беларусі, да лідара гэтай краіны, па-першае, гавораць аб аўтарытэце гэтага лідара, што ён чалавек, які знаходзіцца сапраўды на ўзроўні вышэйшых службовых асоб самых буйных краін па сваім аўтарытэце, прафесіяналізме, па незалежнасці. А з іншага боку, Трамп прадэманстраваў у тым ліку ўвагу да галоўнага саюзніка Расіі, тым самым яшчэ раз падкрэсліўшы, што ў яго ёсць шчырая цікавасць да Расійскай Федэрацыі, саюзнікаў Расійскай Федэрацыі, і ён не выключае, што гэтая цікавасць трансфармуецца ў добрае супрацоўніцтва. І калі тым больш ён прыняў запрашэнне прыехаць у Беларусь, гэта пачатак, можа быць, вельмі вялікага, добрага эканамічнага і палітычнага супрацоўніцтва Злучаных Штатаў Амерыкі з Беларуссю і Расіяй, як саюзнікам Беларусі, — падкрэсліў Мікалай Бардзюжа.

На думку **старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродкам масавай інфармацыі Мікалая БУЗІНА,** тэлефонная размова Прэзідэнтаў Беларусі і ЗША — гэта разуменне ўкладу Рэспублікі і асабіста Прэзідэнта ў нармалізацыю адносін паміж Злучанымі Штатамі і Расійскай Федэрацыяй:



— На працягу апошняга часу наш Прэзідэнт неаднаразова сустракаўся са спецпрадстаўнікамі Дональда Трампа, даваў інтэрв'ю замежным СМІ, у тым ліку Злучаных Штатаў, пастаянна размаўляў з Уладзімірам Пуціным. Ён станавіўся пэўным мостам паміж Захадам і Усходам, што дазваляе знайсці агульныя падыходы, знайсці тыя тэмы, тыя пункты, якія неабходна агаварыць дзвюм вялікім дзяржавам. На мой погляд, гэты дыялог і гэтая гутарка — менавіта прызнанне ўкладу Рэспублікі Беларусь у гэты працэс. Гэта прызнанне той пазітыўнай пазіцыі, якую на працягу многіх гадоў займае Беларусь, — сказаў Мікалай Бузін. — І самае галоўнае — гэта разбурэнне таго міфа, які на працягу вялікага часу стварае Еўропа, што ў Рэспубліцы Беларусь нелегітымная ўлада, нелегітымны Прэзідэнт.

Тон размовы кіраўнікоў дзяржаў сведчыць аб тым, што яны паважліва ставяцца адзін да аднаго, адзначыў дэпутат.

— Яны паважліва ўспрымаюць пазіцыю адзін аднаго і гатовы да далейшага дыялогу. Выклікае пэўны аптымізм фраза, якую напісаў Дональд Трамп у сацсетцы: «Я чакаю сустрэчы з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь». Гэта яшчэ раз падкрэслівае, што Беларусь — краіна, якая адбылася. Гэта краіна, якая, праводзячы шматвектарную палітыку, ніколі не падводзіла сваіх партнёраў. Якая з'яўляецца па-сапраўднаму суверэннай дзяржавай. Менавіта таму Прэзідэнт Злучаных Штатаў так шчыра і дастаткова цёпла размаўляў з нашым лідарам, — падкрэсліў ён. — Мы ніколі не перарываем адносіны. Мы заўсёды настроены на паважлівы двухбаковы дыялог.

### АЛЕ ШТО РАБІЦЬ ЗБЕГЛЫМ?

— Што да нашых збеглых, то ў іх сыходзіць глеба з-пад ног. Чарговы раз Дональд Трамп паказвае, што ў Рэспубліцы Беларусь ёсць рэальны кіраўнік. Ёсць рэальная ўлада, з якой можна размаўляць, з якой можна абмяркоўваць важныя пытанні і знаходзіць кансэнсус. Гэта значыць, той самы лідар заходняга свету адкрытым тэкстам гаворыць усім сваім васалам, што Беларусь — гэта суверэнная краіна, уладу якой ён прызнае, Прэзідэнта якой ён паважае і гатовы весці з імі дыялог. А што ім рабіць? Шукаць сабе альбо новых сюзерэнаў, альбо вяртацца дадому. Іх тут чакаюць, ім ёсць чым тут заняцца, — дадаў Мікалай Бузін.

### ПОГЛЯДЫ НА МНОГІЯ ГЛАБАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ СУЧАСНАСЦІ СУПАДАЮЦЬ

На думку **члена Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Андрэя КРЫВАНОСАВА,** Мінск усё часцей успрымаецца як нейтральная перагаворная пляцоўка, здольная весці бесстаронні дыялог і з Захадам, і з Усходам:



— Факт абмеркавання ўкраінскага крызісу, блізкаўсходніх пытанняў дэманструе, што Мінск усё часцей успрымаецца як нейтральная перагаворная пляцоўка, здольная весці бесстаронні дыялог і з Захадам, і з Усходам.

Ён адзначае, што прынятае Трампам запрашэнне наведаць Беларусь можа стаць знакавай падзеяй, якая пацвярджае новы статус нашай краіны. Асабліва паказальна, што перагаворы адбыліся напярэдадні сустрэчы Трампа і Пуціна, што падкрэслівае важкую ролю беларускага лідара ў міжнародных працэсах:

— Калі Беларусі ўдасца захаваць гэты статус, яна можа стаць важным пасрэднікам у вырашэнні глабальных канфліктаў. Гэта адкрывае перад Мінскам унікальную магчымасць заявіць пра сябе як пра значнага ўдзельніка сусветнай дыпламатыі.

Тэлефонная размова лідараў Амерыкі і Беларусі выклікае аптымізм у справе аднаўлення двухбаковых доўгатэрміновых і стабільных міжнародных адносін, з'яўляецца перадумовай для паляпшэння амерыкана-беларускага дыялогу і адкрывае новыя перспектывы супрацоўніцтва паміж суверэннымі дзяржавамі, упэўнены **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Алег ДЗЯЧЭНКА.**



Ён звяртае ўвагу, што ў сяброўскай гутарцы прэзідэнтаў пераважала не толькі рэгіянальная тэматыка, але абмяркоўвалася і міжнародная праблематыка, а таксама сітуацыя, якая складваецца ў свеце ў цэлым:

— Амерыканцы бачаць той вялікі ўклад, які зрабіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў справу забеспячэння міру на еўрапейскім кантыненце, у тым ліку ў стварэнне ўмоў для ўрэгулявання ўзброенага канфлікту ў паўднёва-ўсходнім рэгіёне Украіны з самага пачатку яго ўзнікнення.

Эксперт таксама адзначае, што ў беларускага і цяперашняга амерыканскага кіраўніцтва супадаюць погляды на многія глабальныя праблемы сучаснасці:

— Напрыклад, іх пазіцыі блізкія па пытанні ўмацавання традыцыйных маральных каштоўнасцяў з выкарыстаннем духоўнага патэнцыялу сусветных рэлігій. Беларусь і Злучаныя Штаты таксама могуць эфектыўна ўзаемадзейнічаць па многіх запатрабаваных сучасным жыццём напрамках міжнароднай палітыкі, уключаючы сферу процідзеяння экстрэмізму, барацьбу з тэрарызмам, наркатрафікам і пераадолення іншых праблем, якія хвалююць сусветную супольнасць.

Алег Дзячэнка канстатуе той факт, што сёння да кансерватыўна думаючых амерыканцаў прыходзіць разуменне неабходнасці сыходу ад канфрантацыі і пераходу да разрадкі міжнароднай напружанасці, збавення ад згубнай спадчыны ранейшай Вашынгтонскай адміністрацыі і адмовы ад агрэсіўных знешнепалітычных памкненняў часткі амерыканскага палітычнага істэблішменту, звязаных з жаданнем пастаянна ўмешвацца ва ўнутраныя справы іншых краін. Ён нагадвае, што знешні доўг ЗША і без гэтых дарагіх знешнепалітычных авантур дасягнуў у бягучым годзе гістарычнага максімуму і перавысіў 36 трыльёнаў долараў.

> **— Час патрабуе сумеснымі намаганнямі рашуча адмовіцца ад старых падыходаў, разарваць заганнае кола**

# ДЫЯЛОГ

## эксперты — аб міратворчай пазіцыі нашай краіны і яе лідара

**санкцыйных пакетаў, прыкрытых квятчастай «дэмакратычнай» фразеалогіяй, і знайсці прынцыпова новыя шляхі да вырашэння наспелых міжнародных праблем, — падкрэслівае суразмоўца.**

— Бо ўсім відавочная безгрунтоўнасць і бесперспектыўнасць фінансава-эканамічных санкцый, якія ствараюць дадатковыя праблемы на дыпламатычным узроўні і не ўлічваюць рэалій сучасных сусветных працэсаў. Таму, перш за ўсё, трэба супрацоўнічаць у галіне эканомікі, што дазволіць кожнаму боку дадатковa атрымаць значныя выгады і перавагі.

### САМІТ НА АЛЯСЦЫ — ПАЛІТЫЧНАЯ СЕНСАЦЫЯ ГОДА

Галоўная ж падзея, за якой сачыў увесь свет, безумоўна, — гэта сустрэча лідараў Расіі і ЗША на Алясцы.



**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Ігар СЯРГЕЕЎ** перакананы, што гэта канструктыўны крок да ўрэгулявання канфлікту ва Украіне, які доўжыцца больш за 11 гадоў:

— Дыялог наспеў ужо даўно. Мяркуючы па першых момантах — поціску рукі, добрым настроі, складзе дэлегацый у фармаце па тры чалавекі з кожнага боку, стала зразумела: размова пойдзе ў рэчышчы забеспячэння міру і бяспекі. Паведамленне аб тым, што кіраўнікі дзяржаў ляцяць з камандай спецыялістаў па эканоміцы, гандлі і іншых сфер дзейнасці, дазволіла выказаць здагадку аб магчымасці адмены санкцый і развіцця двухбаковага супрацоўніцтва, а значыць — выканання першараднай задачы — урэгулявання канфлікту.

Дыялог лідараў наймацнейшых дзяржаў усяляе надзею на больш хуткае завяршэнне зацяжнога канфлікту, аднаўленне кантактаў і далейшае плённае супрацоўніцтва, адзначае сенатар:

**— Тое, што адбываецца паміж Расіяй і Украінай, брацкімі народамі, — вялікая трагедыя, боль якой будзе яшчэ доўга адгукацца ў сэрцах пацярпелых людзей і іх родных і блізкіх. Каб выбудаваць доўгатэрміновыя адносіны, трэба ліквідаваць усе першапрычыны, якія прывялі да крызісу.**

Што датычыцца яго ўрэгулявання, намеснік **начальніка факультэта Генеральнага штаба Узброеных Сіл Ваеннай акадэміі Беларусі Андрэй БАГАДЗЕЛЬ** у эфіры тэлеканала СТБ звярнуў увагу, што яшчэ да пачатку перагавораў асноўным лейтматывам многія лічылі пытанне аб спыненні агню ва Украіне:



— Разам з тым было і разуменне таго, што вырашэнне гэтых пытанняў у адсутнасць прадстаўнікоў Еўропы і Украіны бесперспектыўнае. Усё пачалося на Алясцы. Напэўна, не зусім. Шматвектарная пазіцыя Мінска дазваляе весці перагаворы з нашай дапамогай без рэпутацыйных страт нават самым супрацьлеглым блокам. Не варта думаць, што пяць раундаў перагавораў людзей з каманды Трампа былі прысвечаны лёсу збеглых, гэта быў толькі штрых. Перагаворы былі прысвечаны лёсу ўсходнееўрапейскай бяспекі.



**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Людміла САПЕГА,** каментуючы вынікі перагавораў Уладзіміра Пуціна і Дональда Трампа, якія завяршыліся на Алясцы, звяртае ўвагу на тое, што было б як мінімум неабдумана чакаць ад першай сустрэчы лідараў дзвюх вядучых краін свету нейкіх прарыўных рашэнняў:

**— Як паказвае дыпламатычная практыка, вырашэнне задач падобнай складанасці патрабуе нямала часу і асцярожных, старанна вывераных крокаў. Але калі ў кожнага з бакоў ёсць імкненне вырашыць наяўныя праблемы мірным шляхам, то агульныя падыходы абавязкова знойдуцца.**

На жаль, ва Украіны і яе куратараў з ЕС падобнага імкнення пакуль не назіраецца. Невыпадкова падчас выхаду да прэсы Уладзімір Пуцін выказаў некаторыя асцярогі з нагоды спроб зрыву працэсу мірнага ўрэгулявання з іх боку. Што цалкам вытлумачальна: у выпадку поўнамаштабнага спынення канфлікту, на чым прынцыпова настойвае расійскі бок, кіраўнікам краін Еўрасаюза прыйдзецца павярнуцца тварам да тых эканамічных і сацыяльных праблем, якія апошнім часам літаральна захліснулі іх краіны. І якія дагэтуль тлумачацца імі неабходнасцю процідзеяння ўяўнай расійска-беларускай пагрозе. Гэтая вельмі недальнабачная пазіцыя ўжо паставіла еўрапейскі кантынент на мяжу вялікай вайны. Каб пазбегнуць яе, Дональд Трамп заклікаў ЕС і Украіну далучыцца да распачатага мірнага працэсу з улікам таго, што Расія з'яўляецца адной з магутных у ваенных адносінах краін свету.

У цэлым жа, канстатуе сенатар, саміт на Алясцы можна лічыць палітычнай сенсацыяй года, здольнай кардынальна паўплываць на паляпшэнне сітуацыі як у зоне расійска-украінскага канфлікту, так і свету ў цэлым.

### НЕ ЎСЕ ІМКНУЦЦА ДА РАЗВЯЗКІ КАНФЛІКТУ



**Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы Сяргей КЛІШЭВІЧ** у эфіры «Альфа радыё» звяртае ўвагу, што сам факт сустрэчы — гэта ўжо велізарны плюс для таго, каб хоць неяк пачаць рухацца да міру:

— Мы бачым, што гэтаму міру многія супраціўляюцца, у тым ліку і заходнія палітыкі, таму што гэта адразу абнуляе палітычны рэйтынг тых лідараў, якія забіралі велізарныя сумы ў падаткаплацельшчыкаў і ўкладвалі ў вайну. І абвясціць, што ўсё гэта спыняецца, што яны прайгралі, — для іх гэта палітычная смерць. Ніхто з іх не думае пра ўкраінскі народ, тым больш пра нашых братоў-расіян. Іх задача — ваяваць да самага апошняга ўкраінца.

На думку эксперта, еўрапейскія лідары, як і палітычнае кіраўніцтва Украіны, у любым выпадку будуць шукаць станоўчыя для сябе варыянты выхаду з гэтай сітуацыі:

— Кіеў не ўзяты расійскімі войскамі — выходзіць, вайна не прайграная, а значыць, гэты час для таго, каб падрыхтавацца да пэўнага рэваншу. Вось як яны разважаюць. Цяпер пытанне зрушылася з мёртвай кропкі. Працэс ідзе вельмі павольна, але гэта і зразумела, бо такія пытанні хутка не вырашаюцца. Краевугольны камень, вакол якога сёння развіваецца сітуацыя ва Украіне, — гэта само палітычнае кіраўніцтва гэтай краіны. Калі іх пазіцыя захаваецца, калі гэта ж палітычнае кіраўніцтва застанецца і пасля магчымых мірных пагадненняў, то ні да чаго добрага гэта не прывядзе. Мы ўвесь час будзем чакаць абвастрэння сітуацыі.

На думку парламентарыя, развязка ў першую чаргу ўпіраецца ў палітычнае кіраўніцтва Украіны:

— Хто заўтра будзе кіраваць гэтай краінай? Тыя, хто сёння падтрымліваюць вайну і знаходзяцца пад кантролем французскага, нямецкага, англійскага палітычнага істэблішменту? Ці гэта будуць прадстаўнікі амерыканскіх рэспубліканцаў? Тады, вядома, сітуацыя можа пайсці зусім па іншай траекторыі. Мы назіраем гэтую ваенна-палітычную развязку, знаходзячыся ў інфармацыйным эпіцэнтры гістарычнай падзеі. Самае жахлівае — у гэтай барацьбе ніхто не думае пра ўкраінцаў, пра простых людзей, якія гінуць кожны дзень. Думаюць пра фінансы, пра Нобелеўскую прэмію, пра тое, каб захаваць свой палітычны твар. А наш Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка думае пра самае галоўнае — пра жыццё нашага братняга ўкраінскага народа, якога кожны дзень іх палітычнае кіраўніцтва бяздарна расходуе. Гэта трагедыя, якая адлюстроўваецца і ў нашых сэрцах.


ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания
• Взыскание задолженности
• Проведение торгов
• Ликвидация
• Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор электронного аукциона** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ООО «Озерцо асист», УНП 193102309, г. Минск, ул. Смолячкова, 4, пом. 39, оф. 106 |

**Предмет публичных торгов (электронного аукциона)**

| Лот, № | Наименование | Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 % | Минимальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 % |
|---|---|---|---|
| 1 | **Производственная база,** расположенная по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, г. Дзержинск, ул. Строителей, д. 3, состоящая из: 1) административного здания площадью 1785,8 м²; 2) здания пилорамы площадью 228 м² | 2 860 000,00 | 2 380 000,00 |

**Задаток:** 3 % от начальной цены предмета электронного аукциона. В белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг электронного аукциона** – 5 % процентов от начальной цены лота либо цены за лот, складывающейся в ходе аукциона (от текущей)

Условия участия и порядок проведения электронного аукциона размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной площадки ООО «Индустрия Инноваций» https://iintorgi.by

**Срок подписания договора купли-продажи – 15 (пятнадцать) календарных дней** после электронного аукциона

**Условия оплаты предмета электронного аукциона – 30 (тридцать) календарных дней** со дня заключения договора купли-продажи. **Переход права собственности** – после полной оплаты имущества

**Торги проводятся в соответствии с регламентом ООО «Индустрия Инноваций», размещенным по адресам: https://iintorgi.by**

Победитель электронного аукциона либо единственный участник, которому будет предложен для приобретения предмет электронного аукциона (претендент на покупку), обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 2 % от конечной цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения публичных торгов (аукциона)

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

**Дата и время проведения торгов (аукциона):** 19.09.2025, начало торгов: 10.00, окончание торгов: 16.00.
Заявки на участие в электронном аукционе принимаются с 19.08.2025 с 09.00 по 18.09.2025 г. до 17.00.
Электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |



ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1, www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «БКО-резервуаркомплект», 220140, г. Минск, ул. Притыцкого, д. 62/13, пом. 1 |

**Предмет электронных торгов**

**Производственно-складская база, реализуемая одним лотом** (инв. номера 710/С-54257, 710/С-54259, 710/С-54260, 710/С-54262, 710/С-54263, 710/С-54265, 710/С-54267, 710/С-54268, 710/С-54270, 710/С-59123, 710/С-59124, 710/С-59125, 710/С-59130, 710/С-62671). **Месторасположение:** Могилевская обл., Бобруйский р-н, Ковалевский с/с, южнее д. Ковали (в районе ст. Телуша). **Сведения о земельном участке с кадастровым номером 720882400001000005**: предоставлен на праве аренды по 04.03.2115 г. для размещения объектов промышленности (Земельный участок для содержания и обслуживания битумной базы) общей площадью 1,1960 га.
Подробный перечень капитальных строений и иного имущества, входящего в состав лота, размещен на сайте организатора аукциона ИПМ-Торги (www.ipmtorgi.by)

| | |
|---|---|
| **Начальная цена (без НДС)** | **42,00 бел. руб. (1 б. в.)** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **10 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 11.07.2025 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 01.09.2025 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:**
заявки на участие в электронных торгах принимаются по **29.08.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «Красносельский торг», 231911, Гродненская область, Волковысский район, г. п. Красносельский, ул. Короткая, дом 28 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. Адрес ЭТП: **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов: транспортные средства (б/у), расположенные по адресу: Гродненская область, Волковысский район, г. п. Красносельский, ул. Короткая, дом 28**

| № п/п | Инв. номер | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. (снижение на 5 %) |
|---|---|---|---|
| 1 | 1639 | **Грузовой фургон изотермический MAZ 437043-341, рег. знак AE 0919-4, 2011 г. в.** | **32 718,00** |
| 2 | 1315 | **Легковой седан Ауди А4, рег. знак 0510 АС-4, 1996 г. в.** | **9 006,00** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X. УНП 191 021 390. Получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 рабочих дней** после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by.
**Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by.
Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 17.07.2025

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до момента определения победителя торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 01.09.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Дата и время окончания приема заявок на участие в электронных торгах: по 29.08.2025 до 17.00**
на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17 310-36-37; +375 29-154-34-35. E-mail: auction@cpo.by** |


# МОЖНА ДАЗВОЛІЦЬ САБЕ БОЛЬШ ПАКУПАК



Даходы беларусаў растуць хутчэй за цэны, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю.

«Сітуацыя з цэнамі на ўнутраным рынку захоўваецца стабільная. За ліпень цэны ў краіне выраслі ўсяго на 0,2 працэнта (за сем месяцаў — на 5,6 працэнта). Некаторыя сезонныя тавары, напрыклад агародніна і садавіна, летняе адзенне і абутак, патанненлі, а імпартныя (чай, кава, кандытарскія вырабы, яблыкі), наадварот. Інфляцыя не з'ядае нашы даходы», — сказалі ў МАРГ.

Па выніках першага паўгоддзя рэальныя даходы беларусаў выраслі на 10,2 % у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. «Гэта значыць, што пасля ўліку інфляцыі ў людзей засталося больш грошай, чым раней, — можна дазволіць сабе больш пакупак, адкласці на водпуск або зберагчы. А яшчэ гэта азначае, што зарплаты і пенсіі сталі больш адчувальнымі, базавыя расходы не выраслі крытычна, можна планаваць пакупкі і адчуваць сябе больш упэўнена», — адзначылі ў прэс-службе.

# НА МАНЕТАХ — КАЗКІ І ЗАГАДКІ

Нацыянальны банк з 20 жніўня 2025 года выпускае ў абарачэнне памятныя манеты «Былінка і верабей» серыі «Беларускія народныя казкі», а таксама памятныя манеты «Загадкі» серыі «Беларускі дзіцячы фальклор», паведамілі ў прэс-службе Нацбанка.







Што датычыцца манет «Былінка і верабей», плануецца выпусціць сярэбраную наміналам 20 рублёў, масай 33,63 г, пробай сплаву 925, дыяметрам 50 мм, тыражом 2 тысячы штук, а таксама медна-нікелевую наміналам 1 рубель, масай 49 г, дыяметрам 50 мм, тыражом 5 тысяч штук. На аверсе манеты ў цэнтры — стылізаваная выява па матывах беларускага фальклору. На рэверсе ў цэнтры — стылізаваная выява вераб'я, па крузе — выявы казачных персанажаў і прадметаў, у цэнтры ўнізе — надпіс «Былінка і верабей».

Памятныя манеты «Загадкі» плануюць выпусціць у наступным фармаце: сярэбраную наміналам 20 рублёў, масай 33,63 г, пробай сплаву 925, дыяметрам 38,61 мм, тыражом 2 тысячы штук, а медна-нікелевую — наміналам 1 рубель, масай 26,6 г, дыяметрам 37 мм, тыражом 5 тыс. штук. На аверсе ў цэнтры — стылізаваная выява быка і сілуэты авечак. На рэверсе ў цэнтры — стылізаваныя выявы авечак, парасткаў гароху і гарошын, якія сімвалізуюць зоркі, унізе — выява быка, справа ўверсе — Ярох (персанаж з загадкі), справа ўнізе — надпіс «Загадка».

Выпушчаныя ў абарачэнне манеты з'яўляюцца законным плацежным сродкам Беларусі і абавязковыя да прыёму па намінальным кошце пры ўсіх відах плацяжоў без усялякіх абмежаванняў.

# СФЕРА ІНТАРЭСАЎ

## Днямі Савет Міністраў зацвердзіў пагадненне паміж урадамі Беларусі і Расіі аб супрацоўніцтве ў сферы інтэлектуальнай уласнасці

Пагадненне замацоўвае асноўныя механізмы і кірункі супрацоўніцтва ў сферы прававой аховы аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці, паведамілі ў ДКНТ.

У прыватнасці, прадугледжаны такія кірункі супрацоўніцтва, як абмен інфармацыяй аб заканадаўстве і правапрымяняльнай практыцы ў сферы інтэлектуальнай уласнасці; супрацоўніцтва праваахоўных і мытных органаў; укараненне сучасных інфармацыйных тэхналогій у сферы аховы і абароны правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці ў лічбавым асяроддзі; узаемадзеянне на міжнародных пляцоўках; прафесійная падрыхтоўка, павышэнне кваліфікацыі і правядзенне сумесных навуковых мерапрыемстваў.

Каардынацыйным органам вызначаны Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях.

Пагадненне ўступае ў сілу з даты атрымання па дыпламатычных каналах апошняга пісьмовага паведамлення аб выкананні ўрадамі Беларусі і Расіі ўнутрыдзяржаўных працэдур, неабходных для ўступлення пагаднення ў сілу.


**ЗАО «Центр промышленной оценки»** (УНП 191021390) – проводит первые повторные торги в форме открытого аукциона
по продаже **зданий и сооружений** (17 лотов),
расположенных по адресу:
**Гомельская обл., Мозырский р-н, Михалковский с/с, 15,**
принадлежащих **ОАО «Мозырский спиртоводочный завод»**
(Антикризисный управляющий – ООО «СтанИБор»
(УНП 491343813) –
производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 118-10Б/2016).
**Аукцион состоится 02.09.2025 в 13.00.**
Заявки принимаются **с 9.00 18.08.2025 по 02.09.2025 до 17.00.**
С порядком оформления участия в аукционе, общими правилами проведения можно ознакомиться на **www.bankrot.gov.by**
либо на сайте организатора аукциона www.cpo.by
и по тел. +375 29 805 93 30 (Светлана Павловна);
+375 29 8717025 (Валерий Петрович).
**Аукцион и прием заявок проходит по адресу:**
**г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 512**


# ГАНДАЛЬ БЕЗ МЕЖАЎ

## У ЕАЭС зацверджана Праграма развіцця таргоў на агульным біржавым рынку тавараў

Кіраўнікі ўрадаў краін Еўразійскага эканамічнага саюза днямі зацвердзілі Праграму развіцця таргоў на агульным біржавым рынку тавараў, якая распрацавана ў адпаведнасці са стратэгічнымі кірункамі развіцця еўразійскай эканамічнай інтэграцыі да 2025 года.

Як паведамілі ў БУТБ, дакумент складаецца з чатырох раздзелаў і ўключае: агульныя палажэнні, сістэму мерапрыемстваў, механізмы забеспячэння рэалізацыі, рэсурснае забеспячэнне.

Праграма прадугледжвае тры этапы: распрацоўку дакументаў для фарміравання агульнага біржавога рынку, рэалізацыю пілотных праектаў і правядзенне імітацыйных таргоў, і, нарэшце, старт поўнага функцыянавання біржавога рынку да 2029 года.

— У праграму ўключаны 14 мерапрыемстваў, у тым ліку распрацоўка і прыняцце міжнароднага дагавора аб фарміраванні агульнага біржавога рынку тавараў, пагаднення паміж арганізатарамі таргоў і інфраструктурнымі арганізацыямі, актаў органаў саюза і пратаколаў паміж арганізатарамі таргоў, — дадалі на біржы.



# ЦІ ТАКАЯ СТРАШНАЯ ІНФЛЯЦЫЯ ЯК ЯЕ МАЛЮЮЦЬ

## І якой яна павінна быць? Адназначнага адказу і няма...

**Прынамсі, у навуковай літаратуры, а не ў публіцыстыцы. Інфляцыя не бывае дрэннай і добрай. Яна можа быць прымальнай ці не. Прычым дапушчальнасць значэння існуе не сама па сабе, а ў цеснай сувязі з іншымі макраэканамічнымі паказчыкамі. І, самае галоўнае, зыходзячы з пастаўленых сацыяльна-эканамічных мэт. Ключавая функцыя эканомікі — стварэнне матэрыяльных выгод і іх размеркаванне. У выпадку Беларусі — павышэнне ўзроўню дабрабыту грамадзян і іх якасці жыцця. З пункту гледжання дасягненняў гэтых мэт і трэба разглядаць макраэканамічныя паказчыкі. І інфляцыя таму не выключэнне. Сёлета яна ў нас велікаватая — не будзем хітраваць. Па выніках ліпеня — 7,4 працэнта ў гадавым выражэнні. Несумненна, магло б быць і лепш. Але ў цэлым эканоміка выконвае сваю ключавую мэту: нават на фоне росту цэн узровень жыцця беларусаў павялічваецца: растуць і сярэднія наяўныя даходы, і рэальная заработная плата, і рознічны тавараабарот, які з'яўляецца адлюстраваннем пакупніцкай здольнасці грамадзян.**



Ніводная краіна ў свеце не жыве ў поўнай ізаляцыі і не залежыць ад знешніх фактараў. Асабліва пасля некалькіх дзесяцігоддзяў глабалізацыі, калі выстройваліся доўгія ланцужкі міжнароднага ўзаемадзеяння. Нават такія буйныя і тэарэтычна самадастатковыя эканомікі як ЗША, ЕС, КНР вельмі сур'ёзна залежаць ад знешняй кан'юнктуры. Тым больш, да яе схільная адкрытая эканоміка сярэдніх памераў, а менавіта такой беларуская і з'яўляецца. Яе сціплыя памеры адносна глабальнага ВУП у сто трыльёнаў не дазваляюць ісці напралом, як Вашынгтону ў пытаннях пошлін і гандлёвых здзелак. Але ў нас ёсць перавага: гнуткасць і манеўранасць, каб праслізнуць паміж вялікімі караблямі і высокімі хвалямі, і лавіруючы, ісці да сваёй вызначанай мэты. Магчыма, не прамым шляхам, але прытрымліваючыся асноўнага курсу. І ў гэтым выпадку інфляцыя — ускосны ветразь. Яна не толькі з'яўляецца індыкатарам, але і інструментам кіравання эканомікай.

Мы, спажыўцы, толькі фіксуем рост або зніжэнне (такое таксама бывае) коштаў. Але гэта — факт. А ёсць яшчэ вялікая і складаная падводная частка, у якой хаваюцца прычыны інфляцыі. Яны бываюць розныя. Самы разрэкламаваны сярод шырокай публікі — манетарны фактар: калі ў эканоміку ўпырскваецца па тым ці іншым канале занадта шмат грошай, якія не забяспечаны прапановай. Гэты фактар ярка сябе праявіў падчас празмерна мяккай грашова-крэдытнай палітыкі ў ЗША, ЕС і шэрагу іншых краін, калі пандэмію «залівалі» эмісійнымі грашыма, якія яшчэ называюць верталётнымі. Але гэта не беларускі выпадак. Грашовая маса ў краіне расце практычна ў планавых параметрах. А яна як раз і прагназавалася, зыходзячы з балансу грошай у эканоміцы і забяспечанасці іх таварамі.

Адкуль жа наша інфляцыя? Яна можа быць не толькі ўласнай, але і экспартаванай. На жаль, у нашага ключавога гандлёвага партнёра Расіі цэны растуць досыць дынамічна. І разам з іх таварамі, якіх дастаткова шмат на нашым спажывецкім рынку, а таксама сыравінай і іншай прадукцыяй (якія нашы прадпрыемствы выкарыстоўваюць у вытворчасці), расійская інфляцыя імпартуецца да нас. А на адпускныя кошты замежных вытворцаў нашы ўлады ніяк паўплываць не могуць.

Дакладней — могуць, паклаўшы руку на сэрца, умацаваўшы курс беларускага рубля. І імпарт стане танней. Быццам бы і некаторыя магчымасці для гэтага ёсць: у апошнія месяцы Нацыянальны банк закупляе на біржы валюту, папаўняючы золатавалютныя рэзервы. Яны дасягнулі рэкордных памераў — каля 12 мільярдаў долараў, нашмат перавыканаўшы гадавы план. Тэарэтычна, Нацыянальны банк мог сысці з валютнага рынку, замежная валюта б патаннела, адпаведна, і кошты ў беларускіх рублях у нашых крамах знізіліся б. І імпарт інфляцыі нівеліраваўся б курсавой палітыкай. Але гэта — тэарэтычна. На практыцы не ўсё так проста.

Умацаванне рубля робіць больш танным імпарт, цісне ўніз на кошты — гэта плюс. Але эканоміка — гэта не толькі спажывецкі рынак. Дарагі беларускі рубель робіць нашы тавары даражэйшымі на экспартных рынках — а гэта ўжо велізарны мінус. Па-першае, страта цэнавай канкурэнтаздольнасці на знешніх контурах б'е па прытоку замежнай валюты. А гэта рана ці позна — у залежнасці ад некаторых абставінаў, вельмі балюча ўдарыць па рублю з пункту гледжання ўжо яго паслаблення. Наогул курсавыя скокі, рэзкія і глыбокія, — бяда для эканомікі, збіваюць ўвесь рытм планавання і прагматыку ў вытворчай палітыцы. І шматлікія апытанні топ-менеджараў адлюстроўваюць меркаванне рынку: самы аптымальны курс — стабільны з прагназуемым адхіленнем у той ці іншы бок у рамках зразумелага калідора. І Нацыянальны банк, захоўваючы рынкавы прынцып валютнага рынку, стратэгічна заснаваны на попыце і прапанове, тым не менш, нівеліруе рэзкія рухі ў моманце, якія радасць прыносяць толькі прыхільнікам спекулятыўных здзелак.

Зніжэнне экспартнага патэнцыялу — гэта не толькі ціск у будучыні на курс нацыянальнай валюты. Гэта яшчэ і пытанне аб'ёмаў вытворчасці, загружанасці магутнасцяў — важны паказчык, які ўплывае на прадукцыйнасць працы і, адпаведна, заработную плату. А кажучы іншымі словамі — пакупніцкую здольнасць насельніцтва. Акрамя таго, зніжэнне дзелавой актыўнасці адмоўна ўплывае на плацяжы ў бюджэт. Праблемы казны, у сваю чаргу, выключаюць магчымасці павышэння ўзроўню аплаты працы работнікаў бюджэтнай сферы. А таксама сціскваецца ўнутраны попыт, бо запавольваецца будаўніцтва інфраструктурных аб'ектаў, памяншаюцца аб'ёмы дзяржаўных закупак: для рэальнага сектара гэта — прыбытак. Так, кошты могуць нават зніжацца, але ці будзе ў людзей даход, каб захоўваць спажывецкую плацежа-здольнасць?! Тэхнічна за кошт манетарных інструментаў можна заціснуць інфляцыю да нулявой адзнакі. Пытанне ў іншым: ці выжыве вытворчасць пры такіх умовах? І якія сродкі будуць у кашальках людзей.

Пагаджуся: інфляцыя раздражняе. Але, з другога боку, рэальная заработная плата і даходы насельніцтва ў цэлым растуць з дынамікай каля 10 працэнтаў. Гэта — з улікам ужо інфляцыі. У намінальным значэнні гэты паказчык значна вышэй. Рознічны тавараабарот таксама дадае на 9 працэнтаў, што сведчыць пра рост пакупніцкай здольнасці. Павялічваюцца і дэпазіты — ёсць сродкі для зберажэнняў. Несумненна, трэба імкнуцца да ўзроўню інфляцыі ў 5 працэнтаў. Яна з'яўляецца аптымальнай для беларускай эканомікі. Але ўлічваючы мноства неспрыяльных знешніх фактараў і існуючы ўзровень можна лічыць калі не здавальняючым, то цалкам прымальным. Перш за ўсё з пункту гледжання дасягнення мэт нашай сацыяльна-эканамічнай палітыкі.



Інтэлект ШТУЧНЫ


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**ОАО «Н Холдинг»**
**проводит открытый аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности**
**ОАО «МПОВТ»**

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей**

<table>
<tr><td>ЛОТ № 1</td><td colspan="5">Капитальное строение с инв. № 600/С-148636, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17, район аг. Колодищи. Площадь: 207,2 кв. м. Наименование: Здание склада. Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: Одноэтажное металлическое здание склада. Обременение: аренда.<br>Капитальное строение расположено на земельном участке с кадастровым номером 623683400001000692 площадью 9,7659 га, предоставленном ОАО «МПОВТ» на праве постоянного пользования (срок действия: не установлен).<br>На земельном участке установлены следующие ограничения (обременения): зона санитарной охраны источников артскважина № 32265/78, площадь 9,7659 га</td></tr>
<tr><td>Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN</td><td>142 794,12</td><td>Задаток, BYN</td><td>14 279,41</td><td>Шаг аукциона</td><td>5 %</td></tr>
<tr><td>ЛОТ № 2</td><td colspan="5">Капитальное строение с инв. № 600/С-182240, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/21, вблизи аг. Колодищи. Площадь: 682,2 кв. м. Наименование: Механизированный склад НТ-554 (инв. № 44509). Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: 21А1/к-Механизированный склад НТ-554 (инв. № 44509). Обременение: аренда.<br>Капитальное строение расположено на земельном участке с кадастровым номером 623683400001000692 площадью 9,7659 га, предоставленном ОАО «МПОВТ» на праве постоянного пользования (срок действия: не установлен).<br>На земельном участке установлены следующие ограничения (обременения): зона санитарной охраны источников артскважина № 32265/78, площадь 9,7659 га</td></tr>
<tr><td>Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN</td><td>403 788,00</td><td>Задаток, BYN</td><td>40 378,80</td><td>Шаг аукциона</td><td>5 %</td></tr>
<tr><td>Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны</td><td colspan="5">ОАО «МПОВТ»,<br>Республика Беларусь,<br>220140, г. Минск, ул. Притыцкого, д. 62.<br>Тел. +375 (17) 388 90 99.<br>E-mail: mpovt@mpovt.by</td></tr>
<tr><td>Сведения об организаторе аукциона</td><td colspan="5">ОАО «Н Холдинг»,<br>220029, г. Минск, пр-т Машерова, 11, пом. 1.<br>Тел. 8 029 754 63 46 (Мария)</td></tr>
<tr><td>Срок подписания договора купли-продажи</td><td colspan="5">Договор купли-продажи должен быть заключен в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона</td></tr>
<tr><td>Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона</td><td colspan="5">Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение 5 (пяти) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона, а также в течение 3 (трех) рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона выплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 3 % от цены продажи предмета аукциона на основании счета, выставленного организатором аукциона</td></tr>
<tr><td>Условия оплаты</td><td colspan="5">Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (нерезидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) не позднее дня подачи заявления на участие в аукционе на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр-т Независимости, 56. Получатель – Открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240, ОКПО 37392696.<br>Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты объекта, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона</td></tr>
<tr><td>Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе</td><td colspan="5">Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 22 сентября 2025 г. включительно в рабочие дни с 9.00 до 16.55 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1</td></tr>
<tr><td>Место, дата и время проведения аукциона</td><td colspan="5">Аукцион состоится 23 сентября 2025 года по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, 35-1, зал совещаний ОАО «Н Холдинг»:<br>по Лоту № 1 в 11.00;<br>по Лоту № 2 в 15.00</td></tr>
<tr><td colspan="6">Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от проведения аукциона</td></tr>
</table>

# ВЯЛІКАЯ ВАДА

## У Асіповічах затапляе агароды: як вырашаецца праблема?

**«Нас топіць ужо каторы дзень. Дапамажыце нам, калі ласка, вада паступова падыходзіць з агарода да дома». З такім лістом звярнулася ў «Звязду» жыхарка горада Асіповічы Наталля Трыбушэўская. Разбіраемся ў сітуацыі.**

«Вялікая вада», традыцыйная для Беларусі вясновая праблема ўладальнікаў прысядзібных участкаў, сёлета актуальна і летам: выдалася яно дажджлівым. «Прыйшла вада адкуль не чакалі», нявесела жартуюць агароднікі. Дажджы ператвараюць градкі ў глейкія балоты. «Вялікая вада» адбіваецца на ўраджаі, у які людзі ўклалі і сродкі, і сілы.

### МАШТАБ ПРАБЛЕМЫ

У Трыбушэўскіх, уласна, ніякага агарода на сённяшні дзень няма — градкі перанасычаныя вадой, на іх нічога гэтым летам ужо не вырасце.

— Агарод заліло цалкам, — кажа муж нашай чытачкі Васіль Трыбушэўскі. — Наогул ніякага ўраджаю. Туалет падтапіла, ваду з калонкі піць немагчыма.

Гісторыя з падтапленнем Усходняга ўезда Асіповіч пачалася каля года таму, распавядае ён.

— Першы раз звярнуліся ў МНС, яны прыехалі і сабралі з агарода ваду, — кажа Васіль Васільевіч. — Калі адпампоўвалі ваду другі раз, сказалі, што нямэтазгодна рабіць гэта кожны раз, калі пройдзе дождж, трэба хутчэй вырашаць праблему.

Тады ўладальнікі участкаў уздоўж Усходняга ўезда звярнуліся ў райвыканкам, а таксама напісалі ліст у газету «Звязда».

— Асабліва моцна затоплены тры ўчасткі, — адзначае намеснік старшыні Асіповіцкага райвыканкама Ганна Землянухіна. — Камунальнікі і МНС адводзяць ваду, гэта бясплатна для людзей: па такіх сітуацыях з жыхароў грошай ніколі ніхто не браў.

Але ж гэта — часовая мера, да наступнага моцнага дажджу.

Да рэканструкцыі тратуараў па вуліцы Кастрычніцкай, да якой прымыкае Усходні ўезд (гэта рэканструкцыя была праведзена ў мінулым годзе), такіх глабальных праблем з падтапленнем у жыхароў уезда не было, кажа Васіль Трыбушэўскі.

— Ну, падтоплівала па вясне, нават часам і летам — прыйдзе вада і сыдзе. А ў гэтым годзе ўся вада ідзе да нас у агароды і застаецца тут. Ад гэтай праблемы пакутуем не толькі мы, а яшчэ і двое нашых суседзяў — тыя, хто найбольш бядуюць ад вады. Але ж ёсць яшчэ і чацвёртыя, вунь там пятыя, шостыя, сёмыя, восьмыя, — паказвае на ўчасткі суседзяў Васіль Васільевіч.

Трэба аддаць належнае: мясцовыя ўлады адрэагавалі на зварот грамадзян досыць хутка, канстатуе ён. Галоўны архітэктар раёна, а таксама супрацоўнікі ЖКГ прыехалі на месца і прапанавалі рашэнне, якое сёння актыўна абмяркоўваецца жыхарамі Усходняга ўезда.

### ЛЮДЗІ НА БАЛОЦЕ

Уласна, праблема не новая: мясцовыя інфармацыйныя рэсурсы пішуць пра «вялікую ваду ў Асіповічах» не першы год. Горад, па сутнасці, зусім «плоскі», натуральных ухілаў няма, стаіць ён на «гліняналй лінзе», тлумачыць начальнік аддзела архітэктуры і будаўніцтва Асіповіцкага райвыканкама Іван Малаковіч.

— Вельмі высокі ўзровень грунтовых вод, — адзначае суразмоўнік. — У нас тры пагоркі ёсць у горадзе Асіповічы, дзе можна склеп выкапаць, астатняе — балота. Ад паверхні, калі лета сухое, вада можа на метр ці два знізіцца. А калі падымаецца, як цяпер, — на штык рыдлёўкі ўжо вада.

Адсутнасць ліўневай каналізацыі — звычайная сітуацыя ў невялікіх гарадах. Спецыялісты кажуць, яе пракладка — задавальненне дарагое, раней на ёй эканомілі, бо ў Беларусі не было настолькі моцных дажджоў і навальніц. Сёння клімат змяніўся, і адсутнасць ліўневай каналізацыі ператвараецца ў рэальную праблему, асабліва ў такіх гарадах, як Асіповічы, дзе няма натуральных ухілаў для сцёку вады (якія існуюць, напрыклад, у такім жа невялікім горадзе Горкі) і высокі ўзровень падземных вод, кажа галоўны архітэктар раёна. Ліўневая каналізацыя ў Асіповічах пакуль — толькі на цэнтральнай плошчы і галоўнай вуліцы горада.

— У Мінску, абласных цэнтрах ёсць «ліўнёўкі», у нас ліўневай каналізацыі няма: не закладвалі яе пры будаўніцтве і рэканструкцыі. Горад невялікі, дажджоў няшмат, і ў гэтым не было неабходнасці. А цяпер неабходнасць паўстала, — дадае ён. — Пажадана было б пракласці ліўневую каналізацыю па ўсім горадзе, а пад гэта патрэбны немалыя сродкі.

2025-ы ў нашай краіне аб'яўлены Годам добраўпарадкавання. У Асіповічах добраўпарадкаваннем займаюцца, дарэчы, пастаянна. Яшчэ ў 2019–2020 гадах была запланавана рэканструкцыя тратуараў на той самай вуліцы Кастрычніцкай, да якой прымыкае Усходні ўезд. Тратуары на Кастрычніцкай, як ужо гаварылася, з'явіліся летась. І менавіта з іх з'яўленнем людзі звязваюць праблемы з падтапленнем агародаў.

— Складана казаць пра тое, што і раней тут не было падтапленняў, — падкрэслівае галоўны архітэктар раёна. — «40 гадоў у нас вады не было», — кажуць людзі. Але, калі на тое пайшло, 40 гадоў такіх дажджоў не было!

Праблема з падтапленнем агародаў уздоўж Усходняга ўезда пагаршаецца яшчэ і тым, што ўсе ўчасткі тут заніжаныя ў адносінах да дарогі, канстатуе начальнік участка Асіповіцкага УКП ЖКГ па добраўпарадкаванні Вячаслаў Дубовік. І цяперашнім дажджлівым летам гэта таксама адыграла сваю негатыўную ролю.

### ВЫРАШЭННЕ ПЫТАННЯ

— Кастрычніцкая — вуліца невялікая, кіламетры тры, — працягвае начальнік аддзела архітэктуры і будаўніцтва Асіповіцкага райвыканкама. — Праектаваў яе рэканструкцыю КУП «Магілёўаблдарбуд», і на стадыі праектавання не быў закладзены такі раздзел, як водаадвядзенне. Абследаванне было праведзена, патрабаванні заказчыка (гэта значыць нашы) улічаныя, і ў 2019 годзе мы прынялі праект. Проста яшчэ пяць-шэсць гадоў таму не было настолькі моцных і частых дажджоў і навальніц, як у апошнія гады.

Цяпер праблему даводзіцца вырашаць у экстранным парадку, канстатуе ён.

— Былі на месцы, размаўляў з людзьмі. Там ёсць ужо існуючыя канавы, праз якія мы плануем ажыццяўляць адвядзенне вады. Праз завулак пракладзём трубу, частку агародаў афіцыйна забяром у людзей — гэта 2, максімум 3 метры, там у іх няма градак, адно «балота», — папярэдняя дамоўленасць з уладальнікамі зямельных участкаў ужо дасягнутая — і камунальнікі зробяць нармальныя вадасцёкавыя канавы. Па іх вада будзе сыходзіць з агародаў у трубу і далей — у цэнтральны вадасцёк. Такое рашэнне мы прапанавалі людзям, і яны яго ў цэлым адобрылі. У найбліжэйшы час правядзём сход жыхароў, каб дакументальна замацаваць гэта рашэнне.


Фота носіць ілюстрацыйны характар.

«Закрыць пытанне» з падтапленнем агародаў па Усходнім уездзе мясцовыя ўлады плануюць на працягу трох месяцаў.

— У нас ужо такая сітуацыя была на вуліцы Магілёўскай, мы яе вырашылі: частку пракалі трубамі, забралі з дазволу гаспадароў невялікія «кавалкі» ўчасткаў у людзей, чые агароды найбольш падтапляліся, уладкавалі адкрытыя вадасцёкі, — распавядае Іван Малаковіч.

Акрамя таго, цалкам рэканструкцыя і добраўпарадкаванне на вуліцы Кастрычніцкай яшчэ не завершаны, адзначае дырэктар УКБ Асіповіцкага раёна Павел Туравец.

— Два гады таму летам таксама былі ліўні. Тады на гэтай жа вуліцы, толькі бліжэй да яе пачатку, мы дарогу ўжо заасфальтавалі, а тратуараў яшчэ не было. І вада хлынула па дварах. Людзі сталі пісаць скаргі. Прастору ўздоўж дарог мы часова адсыпалі пяском і гэтым абаранілі людзей. Потым паклалі тратуары, і ўздоўж іх вада стала сыходзіць не па дварах, а ў цэнтральную каналізацыю.

### ПАТРЭБНЫ СУМЕСНЫЯ НАМАГАННІ

У барацьбе з вадой патрэбны сумесныя намаганні, адзначаюць у райвыканкаме, таму што і з ужо існуючым водаадвядзеннем таксама не ўсё проста, падкрэслівае Іван Малаковіч.

— Калі сухое лета — дождж прайшоў, глеба ўвільгатнілася, добрыя ўраджаі і ўсе задаволеныя — частка гаспадароў засыпае вадасцёкавыя канавы. Па вуліцах такія канавы рэгулярна камунальнікі чысцяць, а на ўчастках людзей яны самі — гаспадары. Робім абследаванне, кажу, тут жа была канава для водаадвядзення! А мне ў адказ: «Я яе засыпаў, навошта мне на ўчастку канава?» — распавядае галоўны архітэктар раёна. — Акрамя таго, людзі паляпшаюць свае жыллёвыя ўмовы, падсыпаюць участкі. Я не магу ім гэта забараніць: яны маюць права. Але ў выніку адны ўчасткі атрымліваюцца вышэйшыя, другія ніжэйшыя, і ўся вада сыходзіць да суседзяў, якія свае ўчасткі не падсыпалі. Таму мы і хочам правесці афіцыйнае адчужэнне невялікіх «кавалкаў» зямлі, каб цэнтралізавана правесці дрэнаж з дапамогай тэхнікі і спусціць ваду. Ну, а хто супраць — будзем прасіць гаспадароў саміх пракапаць вадасцёкавыя канавы па нашым праекце, бо на зямлю, якая ва ўласнасці людзей, мы са сваёй тэхнікай заязджаць не маем права. Працуем толькі на землях агульнага карыстання.

Сітуацыя на кантролі, запэўнілі ён, і сумеснымі намаганнямі мясцовыя ўлады і жыхароў будзе вырашана.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ

**Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП»**
**04 сентября 2025 г. в 14.00 проводит повторные торги по продаже следующих объектов**

| № п/п | Наименование объекта продажи | Начальная цена продажи снижена и с учетом НДС 20 %, белорусских рублей | Задаток, белорусских рублей |
|---|---|---|---|
| Лот № 1 | **Автомобиль Skoda Superb, регистрационный знак 1188АТ-6 (легковой седан), кузов № TMBCL23U179017295, 2007 года выпуска** | 6504,00 (шесть тысяч пятьсот четыре рубля 00 копеек) | 650,40 (шестьсот пятьдесят рублей 40 копеек) |

**Собственник имущества:** ОАО «Лента», 212003, г. Могилев, ул. Челюскинцев, 65, Республика Беларусь, УНП 700002794, тел. для осмотра объектов продажи +375297411415.

**Организатор торгов:** Унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1.

**Место проведения торгов:** г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Лот № 1 продается без условий на торгах в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены, с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору торгов, в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения торгов; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов (в двух экземплярах); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком. Задаток перечисляется на расчетный счет: Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП» р/с № BY88ALFA30122641790010270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Могилев, BIC: ALFABY2X, УНП 700016628; физическим лицам – предъявить паспорт; иные документы в соответствии с Положением «О порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в собственности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь, организуемых Унитарным предприятием «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты».

Условия регистрации, участия в торгах, фото объекта продажи размещены на интернет сайте организатора по адресу: **www.mogilev.cci.by.**

**Срок заключения договора купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем)** – в течение 10 рабочих дней после проведения торгов.

Срок оплаты за предметы торгов на условиях заключенного договора купли-продажи.

**Торги состоятся 04 сентября 2025 г. в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».**

Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112.

Последний срок подачи заявления – 03 сентября 2025 г. до 12.00.

Регистрация участников торгов – 04 сентября 2025 г. с 13.30 до 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Телефоны для справок: **(0222) 778032, +375 44 735 00 30** – Жилина Ольга Александровна.

*Извещения о предыдущих торгах по объектам были размещены в газете «Звязда» от 17.04.2025, 13.06.2025, 25.07.2025.*

РЭЧЫ САЛДАТ ПЕРАМОГІ

# «ТЫ БУДЗЕШ ВУЧЫЦЦА НА ВЫДАТНА, А Я ГЭТАК ЖА БУДУ БІЦЬ ФАШЫСТАЎ»

## Аб чым з перадавой пісаў сваім дзецям Леў Даватар

**У зале № 4 Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, якая раскрывае тэму абарончых баёў на тэрыторыі Беларусі, пачатку Вялікай Айчыннай вайны, прадстаўлены комплекс асабістых рэчаў Героя Савецкага Саюза Льва Міхайлавіча Даватара.**

Сярод іх — паштоўкі, якія знакаміты военачальнік адрасаваў сваім дзецям. У перапынках паміж жорсткімі баямі камандзір 2-га гвардзейскага кавалерыйскага корпуса 16-й арміі Заходняга фронту імкнуўся падтрымліваць сувязь з сям'ёй. У адной з паштовак Леў Даватар звяртаўся да свайго сына. «Давай мы з табой паспаборнічаем, — пісаў ён. — Ты будзеш вучыцца на выдатна, а я гэтак жа буду біць фашыстаў».

Паштоўкі, адрасаваныя дарагім людзям, былі перададзены ў музей жонкай легендарнага камандзіра пасля вайны, у 1958 годзе. Як вядома, да Перамогі Леў Даватар не дажыў. Яшчэ праз некалькі гадоў музейныя фонды папоўніліся асабістымі рэчамі Героя Савецкага Саюза: гімнасцёркай, палявой кніжкай-блакнотам, партфелем, компасам, лінейкай. Сямейныя рэліквіі ў музей прынесла дачка Даватара — Рыта.

### 50 ТЫСЯЧ МАРАК — ЗА МЁРТВАГА ДАВАТАРА, 100 ТЫСЯЧ — ЗА ЖЫВОГА

Дарэчы, не многія ведаюць, што Леў Даватар — наш зямляк. Ураджэнец Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці, з сялянскай сям'і, скончыў царкоўнапрыходскую школу, а таксама школу другой ступені. Працаваў на льнопрадзільнай фабрыцы ў Віцебску, актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці.

У шэрагі Чырвонай Арміі камсамолец уступіў у верасні 1924 года. Служыў на розных пасадах, а ў 1929 годзе Леў Даватар скончыў Барысаглебска-Ленінградскую кавалерыйскую школу камсаставу Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Гады службы ў розных воінскіх злучэннях, заканчэнне Ваеннай акадэміі імя М. Фрунзэ дазволілі яму займаць кіруючыя пасады. Перад вайной Леў Даватар быў прызначаны начальнікам штаба 36-й кавалерыйскай дывізіі Беларускай асобай ваеннай акругі.

Калі пачалася Вялікая Айчынная, Леў Даватар лячыўся ў маскоўскім шпіталі. Вярнуцца ў сваю дывізію не атрымалася — яна трапіла ў акружэнне. Афіцэр быў залічаны ў распараджэнне штаба Заходняга фронту. У ліпені 1941 года быў прадстаўлены да першай баявой узнагароды — ордэна Чырвонага Сцяга.



У жніўні таго ж года Леў Міхайлавіч узначальвае Асобную кавалерыйскую групу, сфарміраваную з некалькіх кавалерыйскіх палкоў. Пад яго камандаваннем буйное коннае злучэнне здзейсніла рэйды ў варожы тыл, наносячы ўдары па камунікацыях і жывой сіле гітлераўцаў. Напрыклад, толькі за больш як двухтыднёвы рэйд у лясы і балоты Смаленшчыны даватарцы знішчылі звыш 2500 варожых салдат і афіцэраў, 9 танкаў, больш за дзве сотні машын, некалькі ваенных складоў. Трафейная зброя была перададзена ў партызанскія атрады. Поспехі кавалерыстаў Чырвонай Арміі ў глыбокім варожым тыле наводзілі паніку на фашыстаў.

«За пошукі Льва Міхайлавіча нямецкая армія прапаноўвала ўзнагароджанне, — расказвае **малодшы навуковы супрацоўнік Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Ганна ЛУКАШЭВІЧ.** — 50 тысяч марак — за мёртвага Даватара, 100 тысяч — за жывога. Па тым часе — вялікія грошы! Але ў атачэнні Льва Міхайлавіча здраднікаў не знайшлося. Яго ўсе паважалі, шанавалі як камандзіра. Кавалерысты-даватарцы былі няўлоўныя».

З асабістых запісаў гвардыі генерал-маёра, якія захоўваюцца ў музейнай экспазіцыі, можна даведацца, што сам Даватар думаў аб такой прапанове нямецкага камандавання. «Па-першае, танна прадалі, — пісаў ён. — Па-другое, за нямецкага салдата ці нават генерала я бы ламанага граша не аддаў. І, па-трэцяе, замест жалезных крыжоў я магу даць ім драўляныя» (разам з грашовай узнагародай за жывога або мёртвага Даватара прапаноўваліся нямецкія крыжы).



### МОЦНАЕ СЯБРОЎСТВА І ТРАГІЧНЫ ЛЁС

Восенню 1941 года 3-і кавалерыйскі корпус (26 лістапада 1941 года перайменаваны ў 2-і гвардзейскі кавалерыйскі корпус) пад камандаваннем Даватара ўдзельнічаў у цяжкіх абарончых баях на подступах да Масквы. У тым ліку на валакаламскім напрамку, дзе ў лістападзе 1941 года стаялі на смерць легендарныя панфілаўцы.

Па ўспамінах удзельнікаў тых падзей, генерал Даватар пастаянна знаходзіўся ў дзейных часцях корпуса, падтрымліваў баявы дух кавалерыстаў, якія мужна змагаліся. У ходзе аднаго з баёў пры абароне Масквы 19 снежня 1941 года ён трапіў пад кулямётную чаргу і атрымаў сур'ёзнае раненне. Загінуў. У снежні таго ж года генералу Даватару пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

«Леў Даватар сябраваў з яшчэ адным легендарным камандзірам Вялікай Айчыннай вайны Іванам Панфілавым, — расказвае Ганна Лукашэвіч. — Невыпадкова іх пахаванні на Новадзявочых могілках у Маскве знаходзяцца побач. І загінулі военачальнікі-сябры з розніцай у месяц. Падчас жорсткіх баёў пры абароне Масквы, калі ўсе намаганні былі накіраваны на тое, каб праціўнік не дайшоў да сталіцы».

На момант гібелі адважнаму камандзіру было 38 гадоў. Пасля вызвалення Беларусі сям'я Даватара — жонка і двое дзяцей — вярнуліся з эвакуацыі на радзіму: у Віцебскую вобласць, Бешанковіцкі раён.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**ОАО «Н Холдинг» проводит открытый аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности ОАО «МПОВТ»**

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **ЛОТ № 1** | Капитальное строение с инв. № 600/С-183764, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/33, вблизи аг. Колодищи. Площадь: 161,9 кв. м. Наименование: Хоздвор «Колодищи». Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: 33А1/к-Хоздвор «Колодищи», а-Ворота въездные НПР-1128 (инв. № 32258), б-Ограждение (инв. № 980953), в-Ограждение (инв. № 980954).<br>Капитальное строение с инв. № 600/С-182231, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/26, вблизи аг. Колодищи. Площадь: 11,8 кв. м. Наименование: Помещение ВОХР (проходная № 2) (инв. № 32954). Назначение: Здание проходной (в том числе контрольно-пропускного пункта). Составные части и принадлежности: 26А1/к-Помещение ВОХР (проходная № 2) (инв. № 32954). Обременение: аренда.<br>Капитальное строение с инв. № 600/С-182241, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/25, вблизи аг. Колодищи. Площадь: 73,6 кв. м. Наименование: Склад 65 кв. м (инв. № 50186). Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: 25А1/м-Склад 65 кв. м (инв. № 50186). Обременение: аренда.<br>Капитальное строение с инв. № 600/С-151683, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/3, район аг. Колодищи. Площадь: 83,2 кв. м. Наименование: Административно-бытовое здание. Назначение: Здание административно-хозяйственное. Составные части и принадлежности: Одноэтажное смешанной конструкции административно-бытовое здание с крыльцами. Обременение: аренда.<br>Капитальное строение с инв. № 600/С-183139, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/30, вблизи аг. Колодищи. Площадь: 11,6 кв. м. Наименование: Склад. Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: 30А1/к-Склад.<br>Капитальное строение с инв. № 600/С-182228, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/27, вблизи аг. Колодищи. Площадь: 8,5 кв. м. Наименование: Туалет на 2 очка № 3 (инв. № 32946). Назначение: Здание санитарно-бытового назначения. Составные части и принадлежности: 27А1/к-Туалет на 2 очка № 3 (инв. № 32946).<br>Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 623683400001000692, площадью 9,7659 га, предоставленном ОАО «МПОВТ» на праве постоянного пользования (срок действия: не установлен).<br>На земельном участке установлены следующие ограничения (обременения): зона санитарной охраны источников артскважина № 32265/78, площадь 9,7659 га | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **385 807,62** | **Задаток, BYN** | **38 580,76** | **Шаг аукциона** | **5 %** |
| **ЛОТ № 2** | Капитальное строение с инв. № 600/С-151686, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/5, район аг. Колодищи. Площадь: 372,5 кв. м. Наименование: Склад. Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: Одноэтажное смешанной конструкции здание склада. Обременение: аренда.<br>Капитальное строение с инв. № 600/С-182238, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/14, вблизи аг. Колодищи. Площадь: 993,5 кв. м. Наименование: Ангар (инв. № 40389). Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: 14А1/к-Ангар (инв. № 40389), 1-Пристройка. Обременение: аренда.<br>Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 623683400001000692, площадью 9,7659 га, предоставленном ОАО «МПОВТ» на праве постоянного пользования (срок действия: не установлен).<br>На земельном участке установлены следующие ограничения (обременения): зона санитарной охраны источников артскважина № 32265/78, площадь 9,7659 га | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т.ч. НДС 20 %), BYN** | **875 852,88** | **Задаток, BYN** | **87 585,29** | **Шаг аукциона** | **5 %** |

| | |
|---|---|
| **Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «МПОВТ»<br>Республика Беларусь, 220140, г. Минск, ул. Притыцкого, д. 62<br>Тел. +375 (17) 388 90 99.<br>E-mail: mpovt@mpovt.by |
| **Сведения об организаторе аукциона** | ОАО «Н Холдинг»<br>220029, г. Минск, пр-т Машерова, 11, пом. 1.<br>Тел.: 8 029 754 63 46 (Мария) |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение 5 (пяти) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона, а также в течение 3 (трех) рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона выплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 3 % от цены продажи предмета аукциона на основании счета, выставленного организатором аукциона |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (не резидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) не позднее дня подачи заявления на участие в аукционе на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр-т Независимости, 56. Получатель – Открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240, ОКПО 37392696.<br>Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 23 сентября 2025 включительно** в рабочие дни с 9.00 до 16.55 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1 |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Аукцион состоится **24 сентября 2025 года** по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, 35-1, зал совещаний ОАО «Н Холдинг»:<br>по Лоту № 1 в 11.00;<br>по Лоту № 2 в 15.00 |

Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время, без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от проведения аукциона

# ДОБРАЕ ПОМНІЦЦА ДОЎГА...

**Благое, кажуць, яшчэ даўжэй**

«Дзіцятка, вярніся!.. Ты спаднічку надзець забылася», — жахнулася баба Люба, убачыўшы суседчыну дачку ў каротчусенькай (з-пад кофты не відно) сукеначцы.
Жахнулася напрадвесні і толькі аднойчы: упершыню пасля зімы прысеўшы на лавачцы каля пад'езда.
Цяпер, і насядзеўшыся, і наглядзеўшыся, болей не пужаецца: прывыкла, што вось так, «без спаднічак» ходзяць многія.
А з маладых дык, мусіць, усе? Мода...

## ПАРАЛЕЛІ

Раніца. Трамвай. Трыццаць-сорак хвілін дарогі — столькі ж чытання: яму, як правіла, не перашкаджаюць ні рэкламныя абвесткі, ні кантралёры, ні пасажыры, якія ўстаюць альбо садзяцца побач... Хіба надоечы?

Праз дзіркі ў джынсах выглядалі ногі — худыя, кастлявыя, у той дзень — ссінелыя ад холаду...

Некалі даўно акурат такія ж можна было ўбачыць у крамах — у... замарожаных курэй.

## ХТО КАГО ЛЮБІЦЬ...

Некалі раней у грамадскім транспарце і сапраўды ці не ўсе чыталі — газеты, часопісы, кнігі.

Цяпер, дзякуючы гаджэтам, поўны разброд, бо нехта піша, нехта глядзіць кіно, нешта слухае праз навушнікі, а ўжо гаворыць... Здараецца, мала, але...

У метро у аднаго з мужчын, што прысеў на лаўку для інвалідаў, «спявае» мабільнік. На сувязі (то-бок на экранчыку — «нам зверху бачна ўсё») — «Любімая». Дзядзька ёй ўсміхаецца, вітаецца, з насцярогай слухае, што яна кажа, маркуючы па твары, — злуе, спрабуе запярэчыць і слова ўставіць не можа. Зноў слухае, «зеленее ад злосці», кажа (досыць гучна): «Пайшла ты...» (і нават куды).

Пасля гэтага, яшчэ раз мігнуўшы словам «любімая», экранчык гасне, размова абрываецца.

...Суседзі расіяне кажуць, што «милые бранятся — только тешатся», беларусы — «хто каго любіць, той таго чубіць». А ўжо гладзіць па чубе ці не... Як пашчасціць.

## ЁСЦЬ ПРАВА...

Я ніколі не прамяняў бы сваіх сяброў, сваё цудоўнае жыццё, сям'ю на менш сівыя валасы і больш пляскаты жывот. Гэта — Маркес.

Смерці я не баюся... Баюся за сваіх блізкіх. Баюся выпадковасцяў для сяброў. Баюся выглядаць старым. Гэта — Шырвіндт.

Неяк разам з жонкай (першай і, дарэчы, апошняй), яны з'ехалі на дачу, пайшлі гуляць — па дарозе зазірнулі ў краму, дзе, вядома ж, былі заўважаны. Грузчык, які раней працаваў слесарам у іхнім дачным кааператыве, кінуўся насустрач, стаў казаць, як даўно іх не бачыў, потым — распытваць, а што гэта зрабілася, чаму яны так дрэнна выглядаюць: пастарэлі — аж страшна глядзець!



Пасля такіх «кампліментаў» пара заспяшалася выйсці з крамы, адарвацца ад шапачнага знаёмца. Ды дзе там: ён рушыў следам, каб пабачыць людзей яшчэ раз і прызнаць, што тут, на вуліцы, відок у іх яшчэ горшы.

Гэта з успамінаў — акцёра, рэжысёра, педагога, сцэнарыста, гумарыста... Які (светлай памяці!) так хораша смяяўся з іншых.

І з сябе.

## ЦЁТКА...

З дому на работу, з работы дамоў — міма любімай царквы і Вайсковых могілак, дзе знайшлі свой спачын Купала і Колас, іх жонкі-спадарожніцы.

Купалаву — Уладзіславу Францаўну — знаёмцы, любячы, звалі папросту — цётка Уладзя.

...Валянцін Таўлай расказаў Янку Брылю, як улетку 45-га на абед да яе трапіў выпадковы госць — літаратурны крытык («вучоны кат» ды «скуралуп»), як стаў даводзіць, што ён ужо не той, што быў перад вайною... «От еш, — перапыніла яго адкрытая і гасцінная Купаліха. — Сабакам быў, сабакам і застаўся, але ж еш!»

Вось такая была цётка.

## ДОБРАЕ ПОМНІЦЦА ДОЎГА...

Аніводная маці, мусіць, не хацела б, каб сын ажаніўся ў 20, каб за жонку выбраў звычайнае дзяўчо ды яшчэ і з правінцыі?

Вось і Макараўна змірыцца не магла: не любіла, не прымала сваю нявестку ні праз год пасля вяселля, ні праз пяць. І не столькі таму, што маладзіца аказалася нейкай нядбайніцай, не... Маці мела каго любіць: у яе дачушка расла — прыгожая, вясёлая, здольная... Ну як жа было не песціць, як не слугаваць?! Любы ж капрыз...

Балазе ў дзяўчынкі, у дзеўкі іх, капрызаў, без ліку было — куды менш, чым у маці грошай. Але ж тая старалася, зарабляла: гадамі, з апошняга як магла слугавала дачушцы...

Не заўважыла, як знясілела, як зусім злягла.



Добра, што сын непаводдаль жыў: з жонкай, з дзецьмі яны штодня заходзілі да хворай, праведвалі, дапамагалі, урэшце з лыжачкі кармілі (ну што тут будзеш рабіць?!), абмывалі, забаўлялі, суцяшалі... Хоць вось гэта, апошняе, і вельмі цяжка было, бо матуля днямі-начамі ўсё роўна глядзела на дзверы: чакала дачку, пераживала, што яна разводзіцца — то з першым сваім, то з другім, што выходзіць за трэцяга... Часу не мае прыехаць.

Хіба на пахаванне?

І потым яшчэ раз — на сорак дзён, каб па справядлівасці, то-бок пароўну (?!) падзяліць з братам спадчыну.

Ён таргавацца не стаў. Жонка яму не пярэчыла. Больш за тое, вельмі прасіла залвіцу, каб тая ўзяла што з маміных рэчаў — абразы, тэлевізар, швейную машынку, посуд...

— Вось гэтую вазу яна любіла і гэты абрус... Лыжачкі вазьмі... Хай будзе ў сям'і — на памяць.

— Не, — за сябе і дзяцей адказала дачка. — Нам нічога не трэба. Мы і так будзем маму помніць.

...А ўспамінаць — штодня ці хоць часцяком — можа, трошкі... сорамна?

## ДЗЕ ЦЕСНА...

Яўрэйская прыказка «Калі жэніцца ўдавец з удавою — спаць лажацца ўчацвярых».

Гэта, напэўна, праўда, хоць шлюбаў такіх няшмат. Куды больш па сённяшнім часе, калі жэняцца разведзеныя — хто двойчы, хто, можа, тройчы... А калі падлічыць яшчэ і грамадзянскія...

Дзе цесна, там пацешна. Ды не заўжды.

## АДНА ПЧАЛА МЁДУ НЕ НАНОСІЦЬ

Сталіца, запраўка, машына справа, машына злева... На адной даўно прыбылае: «Если вам мешает мое авто, позвоните...». Далей — нумар тэлефона.

Яны ж, тыя нумары, і на дзвюх суседніх, мусіць, дзявочых іншамарках, бо пад досыць нечаканым: «Буду, когда приду» і трохі сумным: «Ушла спасать мир».

Для адной — гэта, відаць, непасільная справа.

## У КАДРЫ І ЗА КАДРАМ

Экзотыка: у нашым мястэчку Сураж з аднаго берага ракі на другі можна пераплысць на пароме — бясплатна, ходзіць праз кожныя 30 хвілін.

...Што цікава — побач з паромам на прыколе стаіць судна пад назвай «Тытанік».

Кажуць, яго пасажырам на вячэру падавалі вустрыц, ікру бялугі, курыцу з малінавым соусам па-гвінейску, качыныя грудкі ў мадэры, смажанае ягнятка з мятным соусам...

Людзі ўсё гэта елі, запівалі цудоўнымі напіткамі, любаваліся акіянам, слухалі жывую музыку (граў аркестр)... Аднак зайздросціць тут няма чаму, бо вячэра была апошняй: на лайнеры, які патануў у 1912-м, загінула 1500 чалавек.

Адкуль цалкам лагічная выснова: не трэба заглядацца ды дзівам дзівіцца на чужое багацце, бо гэта і сапраўды хіба што кадр, сцэна. Ніхто не ведае, ШТО за ёй і ШТО будзе потым.

Найлепей глядзець у сваю талерку і жыць сваё жыццё.

**Валянціна ДОЎНАР.**


**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА**

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении повторных электронных торгов **№ 2025.Ч.002.00190** по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by/.

**Продавец:** ОАО «Знамя индустриализации», 210017, Республика Беларусь, г. Витебск, ул. Гагарина, 11.
**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, **https://etpvit.by.**

**Дата и время проведения торгов: 19.09.2025 в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).**

**Лот № 1.** Кран-балка однопролетная опорная г. п. 3,2 т, с инв. № 28.
**Нач. цена:** 8800,00 бел. руб. без учета НДС.
**Задаток:** 880,00 бел. руб.

**Лот № 2.** Настольно-сверлильный станок с инв. № 39.
**Нач. цена:** 2400,00 бел. руб. без учета НДС.
**Задаток:** 240,00 бел. руб.

**Лот № 3.** Станок круглопильный Ц 6-2 с инв. № 14.
**Нач. цена:** 1900,00 бел. руб. без учета НДС.
**Задаток:** 190,00 бел. руб.

**Лот № 4.** Станок токарный с инв. № 63.
**Нач. цена:** 1900,00 бел. руб. без учета НДС.
**Задаток:** 190,00 бел. руб.

**Лот № 5.** Лесопильная рама с двумя подкатными тележками для подачи бревен с инв. № 15.
**Нач. цена:** 5100,00 бел. руб. без учета НДС.
**Задаток:** 510,00 бел. руб.

**Лот № 6.** Станок фрезерный с инв. № 19.
**Нач. цена:** 1900,00 бел. руб. без учета НДС.
**Задаток:** 190,00 бел. руб.

**Лот № 7.** Станок фуговальный с инв. № 34.
**Нач. цена:** 950,00 бел. руб. без учета НДС.
**Задаток:** 95,00 бел. руб.

**Лот № 8.** Станок рейсмусовый МП 9-16-69 с инв. № 196.
**Нач. цена:** 3500,00 бел. руб. без учета НДС.
**Задаток:** 350,00 бел. руб.

**Лот № 9.** Станок рейсмусовый СР401 с инв. № 231.
**Нач. цена:** 2700,00 бел. руб. без учета НДС.
**Задаток:** 270,00 бел. руб.

**Лот № 10.** Станок шипорезный односторонний Ш0 16-4 с инв. № 18.
**Нач. цена:** 4800,00 бел. руб. без учета НДС.
**Задаток:** 480,00 бел. руб.

**Лот № 11.** Станок круглопильный торцовочный с инв. № 17.
**Нач. цена:** 1600,00 бел. руб. без учета НДС.
**Задаток:** 160,00 бел. руб.

**Лот № 12.** Станок шлифовальный с инв. № 31.
**Нач. цена:** 1400,00 бел. руб. без учета НДС.
**Задаток:** 140,00 бел. руб.

**Лот № 13.** Станок круглопильный торцовочный с инв. № 29.
**Нач. цена:** 1600,00 бел. руб. без учета НДС.
**Задаток:** 160,00 бел. руб.

**Лот № 14.** Станок круглопильный раскройный с инв. № 048.
**Нач. цена:** 1200,00 бел. руб. без учета НДС.
**Задаток:** 120,00 бел. руб.

**Лот № 15.** Станок сверлильный с инв. № 72.
**Нач. цена:** 2500,00 бел. руб. без учета НДС.
**Задаток:** 250,00 бел. руб.

**Местонахождение имущества: Витебская обл., г. п. Ушачи, ул. Октябрьская, 31.**

Электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by».

**Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу: https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

**Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 18.09.2025.**

**Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с:** №BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Условия электронных торгов**: Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 10 (десяти) рабочих дней с даты проведения электронных торгов и утверждения протокола электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение эл. торгов, в т. ч. расходы связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для проведения эл. торгов, расходы Продавца на проведение оценки предмета эл. торгов, оплатить услуги Оператора ЭТП; заключить договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 10 (десяти) календарных дней со дня проведения электронных торгов; оплатить за предмет эл. торгов в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи; оплатить НДС в размере 20 % сверх цены продажи предмета электронных торгов. Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до наступления даты их проведения.

С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: «Движимое имущество». Извещения о проведении электронных торгов опубликованы на официальных сайтах Государственного комитета по имуществу https://au.nca.by/ (№32508), Витебского облисполкома https://vitebsk-region.gov.by/inform/business/nedvizhimost-i-privatizatsiya/.

Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375445928209, Светлана Георгиевна.

СВЕТ КНІГ

# НАТХНЯЕМСЯ НА НОВЫЯ ВЫШЫНІ

Любое кніжнае выданне дае магчымасць сустрэчы аўтара са сваёй аўдыторыяй. Незалежна ад зместу кнігі, узросту чытача і кантэксту іх першага знаёмства заўсёды адбываюцца цуды і адкрыцці рознага маштабу. Мы знаходзім новае альбо па-іншаму глядзім на знаёмае, разумеем сутнасць, адшукваем патрэбныя адказы ці проста вучымся,назіраючы за героямі... Да такіх карысных кніжных крыніц можна аднесці і навінкі Выдавецкага дома «Звязда», пра якія расказваем сёння.

## УСЁ ПАЧЫНАЕЦЦА СА ЗВЫЧКІ




Менавіта такую выснову можа зрабіць чытач падчас знаёмства з новай кнігай Ірыны Зарэцкай «Усё пачынаецца з фанціка!». Галоўны герой фантастычнага апавядання Віця — хлопчык, які не любіць наводзіць парадак у сваім пакоі. І, як тое часта здараецца, там пасяліліся Гармідар і Сумятня. Ды не проста з'явіліся, а пачалі лічыць сябе паўнавартаснымі гаспадарамі чужой жылплошчы... Каб пазбавіцца ад няпрошаных гасцей, нашаму герою давядзецца прыкласці шмат намаганняў. А сам ён такім чынам набудзе новую карысную звычку.

Выданне адрасавана дзецям дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту. Гісторыя наглядна паказвае, што любы поспех і пераўтварэнні ў жыцці пачынаюцца з маленькіх крокаў. Кніга прывучае сваіх чытачоў да працы, парадку, стараннасці і няспынных штодзённай работы над сабой.

## ТАЯМНІЦА СВЕТУ ЛІТАР




Кніга «Займальная азбука» Міхаіла Дзеравянкі стане выдатным спадарожнікам дзеткам дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту, якія толькі пачынаюць знаёміцца з сусветам чытання, дзе з дапамогай літар, слоў, сказаў можна спазнаваць навакольную рэальнасць у новых фарбах. На старонках выдання дзеці не проста знойдуць літары, але і пазнаёмяцца з імі праз вершы і заданні. Асаблівае аздабленне кніга мае і дзякуючы ілюстрацыям мастака Алены Лукоўскай.

## МАЛАДЫ ПОГЛЯД НА ВЕЧНАЕ




А вось кніга «Праз фортку сэрца» Наталлі Святловай — гэта сапраўдная знаходка для аматараў паэзіі. У дэбютным паэтычным зборніку чытачы знойдуць інтымную і філасофскую лірыку, што дазволіць пазнаёміцца з творчасцю маладога аўтара, дзе вершы напоўнены шчырасцю, як на споведзі, дзе душа наросхрыст і прагне пакаяцца, а пасля ачышчаная ўзлятае на новыя вышыні.

Аднак, як тое часта бывае, чытаючы думкі паэта, можна так шмат знайсці таго, што адгукнецца асабістым, што абудзіць успаміны, разважанні і эмоцыі. Паэзія Наталлі Святловай — новы, малады погляд на актуальныя тэмы: прызнанне, каханне, сумленне. «Няма нічога больш каштоўнага,/ чым імгненне:/ дзе я,/ дзе ты,/ дзе мы,/ дзе нашы рукі,/ дзе іх цалуеш ты». І тонкае сузіранне, і глыбокая рэфлексія ў вершах аўтара ўвасабляюцца ў радкі, дзе праз усе выпрабаванні мы знаходзім прагу жыць.

**Алена ДРАПКО.**

КІНО

# З ПАМЯЦЦЮ АБ ЛЕГЕНДЗЕ

## У Смалявіцкім раёне стартавалі здымкі беларуска-расійскага фільма пра Бацьку Міная

Кінастужка «Бацька Мінай. Партызанская легенда» раскажа гісторыю Героя Савецкага Саюза, беларускага партызана Міная Шмырова. Як паведамляе БелТА, рэжысёрам карціны выступае народны артыст Расіі Ігар Угольнікаў, які ўдзельнічаў у стварэнні фільмаў «У жніўні 41-га» і «Брэсцкая крэпасць». Бацьку Міная на экране ўвасобіць народны артыст Расіі Аляксей Краўчанка, які выканаў галоўную ролю ў легендарнай ваеннай драме «Ідзі і глядзі», па сцэнарыі беларускага пісьменніка Алеся Адамовіча.



Па словах генеральнага дырэктара студыі «ВаенФільм» рэжысёра Ігара Угольнікава, для вытворчасці і стварэння гэтай карціны аб'ядналі свае намаганні студыі «Беларусьфільм» і «ВаенФільм». Вельмі старанна падышлі да пошуку ўсіх матэрыялаў, напісання сцэнарыя і падбору акцёраў, а 17 жніўня пачалася работа на натурнай пляцоўцы «Беларусьфільма». Здымачнай камандзе выдзелена 80 гектараў зямлі і натуральныя дэкарацыі, у тым ліку зямлянкі і партызанскі лагер. У стварэнні кіно ўдзельнічаюць каскадзёры, выкарыстоўваецца ваенная тэхніка. Ігар Угольнікаў таксама падкрэсліў, што роля Бацькі Міная пісалася менавіта для Краўчанкі.

Расійскі акцёр у сваю чаргу заўважыў, што ўпершыню за 40 гадоў ён апынуўся на месцы здымак фільма «Ідзі і глядзі» і гэта, безумоўна, абудзіла ў яго асаблівыя пачуцці. «Наперадзе вялізная, цяжкая работа. Рэдка здараецца, што ты хочаш не проста акунуцца з галавой, а патануць у рабоце ў добрым сэнсе слова, але гэта той выпадак», — дадаў артыст.

Генеральны дырэктар Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Дзмітрый Сямёнаў падкрэсліў, што здымкі фільма пра Бацьку Міная — знакавая падзея, бо ён прысвечаны агульнай Перамозе і тым памятным датам, якія братэрскія народы заўсёды адзначаюць разам.

Ён зазначыў, што ўжо праведзена вялікая работа па падборы каманды і падрыхтоўцы да здымак, бо тое, якім мы ўбачым кіно, залежыць ад якасці каманды, якая сабрана менавіта пад гэты праект. Сярод артыстаў ёсць як расійскія, так і беларускія.

«Варта заўважыць, што два бакі працуюць на агульны вынік. Самааддана рухаемся да нашай мэты. Здымкі будуць дастаткова складаныя, тым больш што тэма Вялікай Айчыннай вайны для беларусаў не проста нешта ў падручніку або навінавай стужцы. Яна важная для нас на генетычным узроўні, у сэрцы, у крыві», — заўважыў Дзмітрый Сямёнаў.

На яго думку, першая сумесная работа «Беларусьфільма» і «ВаенФільма» можа стаць добрым пачаткам для працяглага супрацоўніцтва і новых яркіх праектаў. Дзмітрый Сямёнаў падкрэсліў, што на гэты момант на «Беларусьфільме» ідзе работа над дзевяццю праектамі, тры з іх — дакументальныя. Ён спадзяецца, што партызанская кінастужка, якая павінна выйсці на экраны ў маі-чэрвені наступнага года, запомніцца гледачам і знойдзе водгук у іх сэрцах.

**Фота БелТА.**

## Извещение о повторном открытом аукционе по продаже не завершенного строительством жилого дома и земельного участка в частную собственность в г. Гродно 9 сентября 2025 года

| № лота | Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер | Площадь земельного участка (га) | Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения | Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона, руб. | Начальная цена предмета аукциона (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения; земельного участка), руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Гродненская область, г. Гродно, ул. Янки Мавра, 28 У-389, микрорайон «Заболоть» 440100000002006925** | 0,0983 | Незавершенное незаконсервированное капитальное строение, площадь застройки: 113 кв. м, фундамент: фундаментные блоки, подземных этажей: 1 (стены: фундаментные блоки) | 382,44 | 40 284,27 (12 661,97; 27 622,30) | 8 000 |

Целевое назначение: земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Возможность подключения к внеплощадочным сетям водоснабжения, газоснабжения, электроснабжения и пр., и точки подключения определяются проектом. Земельный участок может иметь ограничения и обременения. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: внесение платы за предмет аукциона; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; продолжить строительство жилого дома в установленный срок. Победитель аукциона обязан возместить затраты в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 г. № 298 и решением Гродненского горисполкома от 12.04.2022 г. № 260.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», телефоны: +375 (152) 626055, 626056.

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в указанном размере, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление № 400 ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, код назначения платежа 40901, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению; представить в коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы; заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования; дополнительно представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом негосударственного юридического лица РБ – доверенность, выданная юр. лицом, документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

**Аукцион состоится 9 сентября 2025 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).**

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 с 22 августа по 3 сентября 2025 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке продажи, не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220.

Аукцион проводится аукционистом при наличии двух или более участников аукциона. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер не поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды последнюю цену и объявляет о продаже предмета аукциона, а участника аукциона – победителем аукциона в отношении соответствующего предмета аукциона. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов. Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан: внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения (информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись); выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона. После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся. При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся, решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу. Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

СПОРТ-ТАЙМ

# ХАКЕЙ ВЯРНУЎСЯ Ў МІНСК

## «Дынама-Мінск» у прадчуванні новага сезона КХЛ



**Рэгулярны чэмпіянат Кантынентальнай хакейнай лігі яшчэ не пачаўся, а хакейны клуб «Дынама-Мінск» ужо ў страі. На мінулым тыдні «зубры» выступілі на перадсезонным турніры «Кубак Мінска» з удзелам чатырох каманд КХЛ.**



Першым сапернікам мінскіх хакеістаў стала «Лада» з Тальяці. Колеры «Дынама-Мінск» у гэтым матчы абаранялі напалову члены асноўнай каманды, напалову — маладыя хакеісты клубнай сістэмы і гульцы на прагляданых кантрактах — для іх турнір стаў своеасаблівай праверкай. І яны яе вытрымалі: вынік матчу з «Ладай» — 3:2 на карысць «Дынама».

Адметны факт. Першапачаткова квіткі на матч прадаваліся толькі на ніжні ярус «Чыжоўка-Арэны», але з-за ажыятажу аматараў былі адкрыты і верхнія сектары.

«Мінск даўно стаў практычна родным горадам для многіх клубаў КХЛ. І гэта невыпадкова, бо тут створаны выдатныя ўмовы для гульні ў хакей. Таксама невыпадкова аднаўленне правядзення Кубка Мінска, паколькі ў нас выдатныя арэны і самыя лепшыя балельшчыкі. Жадаю, каб сталічны лёд быў для ўдзельнікаў бяспечным і гасцінным, а турнір стаў традыцыйным», — падкрэсліў **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Дзмітрый БАСКАЎ.**

На жаль, у наступных матчах «зубры» ўжо не так радавалі сваіх аматараў. У другім яны ўступілі «Адміралу» з Уладзівастока з вынікам 5:2. Дарэчы, у гэтай гульні за «Дынама-Мінск» дэбютавалі галкіпер Зак Фукале і абаронца Дарэн Дзіц.

Трэцім сапернікам мінчан на дамашнім турніры стаў «Металург» з Магнітагорска. Але і ў гэтым матчы родны лёд не дапамог. Вынік — 1:3 на карысць гасцей.

Па традыцыі, паводле вынікаў турніру вызначаюцца лепшыя гульцы. Найлепшым брамнікам прызнаны Адам Хуска («Адмірал»), найлепшым абаронцам — Джош Брук («Дынама-Мінск»), найлепшым нападаючым стаў Дзмітрый Сіланцьеў («Магнітагорск»). MVP (самы каштоўны ігрок) — Раман Канцараў («Металург»).

Што датычыцца гульні «Дынама-Мінск», то не варта забываць, што зараз усе сілы каманды скіраваны на рэгулярны чэмпіянат Кантынентальнай хакейнай лігі, які стартуе ў пачатку верасня. А такія турніры, як «Кубак Мінска» — гэта выдатная магчымасць паглядзець на сябе збоку, вызначыць памылкі і недахопы і аператыўна іх выправіць. Ды і работа над саставам каманды яшчэ не скончылася.

«У міжсезонне мы дастаткова плённа папрацавалі. Здолелі захаваць касцяк каманды. Так, некаторыя хакеісты пакінулі каманду, але мы дзейнічаем зыходзячы з сітуацыі. Працэс фарміравання каманды яшчэ не завершаны. Думаю, у бліжэйшы час варта чакаць новыя набыцці. Мы да гэтага ідзём, даследуем рынак, работа скаўцкага аддзела працягваецца кругласутачна. У бліжэйшы час мы, думаю, кропкава ўзмоцнімся, каб каманда выглядала больш збалансаванай», — адзначыў **генеральны дырэктар «Дынама-Мінск» Арцём КАРКОЦКІ** ў інтэрв'ю «Вынікам тыдня» на тэлеканале «Беларусь-5».

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА.**

НАДВОР'Е

# БЫВАЙ ЖА, ЛЕЦЕЙКА, БЫВАЙ!..

## Жнівень з восеньскім адценнем



**«Каляндарнае лета набліжаецца да свайго завяршэння, і жнівень паступова набывае восеньскія рысы. Пры актыўным развіцці атмасферных працэсаў у начны час месцамі будуць моцныя ападкі, на працягу сутак не выключаныя навальніцы. Пры гэтым начныя мінімумы будуць вагацца ад 6-8 да 13-15 градусаў цяпла, а дзённыя максімумы будуць у межах ад 16-19 да 25-28 градусаў вышэй за нуль», — распавялі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У аўторак, 19 жніўня, пераважна без ападкаў. У начныя і ранішнія гадзіны ў некаторых раёнах магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ноччу складзе 8—13 градусаў вышэй за нуль, месцамі — плюс 6-7. Днём будзе 19—25 градусаў цяпла.

Уначы ў сераду, 20 жніўня, кароткачасовыя дажджы пройдуць месцамі па поўначы, днём ападкі чакаюцца на большай частцы тэрыторыі краіны. У дзённы час у некаторых раёнах магчымыя навальніцы. Уначы і раніцай месцамі верагодны слабы туман. Тэмпература паветра ноччу складзе 7—14 градусаў вышэй за нуль. Днём будзе ад плюс 18 градусаў па поўначы да плюс 28-мі па паўднёвым захадзе.

У чацвер, 21 жніўня, ноччу на большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдуць дажджы, у некаторых раёнах — моцныя. Днём месцамі па краіне прагназуюцца кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах магчымыя навальніцы. Уначы і раніцай месцамі чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ноччу складзе 9—15 градусаў цяпла, па паўночным захадзе — плюс 6-8. Днём будзе 16—23 градусы вышэй за нуль, па поўдні — да плюс 27.

На большай частцы тэрыторыі краіны ў пятніцу, 22 жніўня, будуць ісці дажджы, месцамі магчымыя моцныя. У некаторых раёнах — навальніцы. Уначы і раніцай месцамі прагназуецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 6 градусаў па поўначы да плюс 15 градусаў па паўднёвым усходзе. Днём будзе 14—20 градусаў цяпла, у заходніх раёнах — да плюс 22.

У суботу, 23 жніўня, ноччу месцамі па паўднёвым усходзе, днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. У дзённы час месцамі магчымыя навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 6—13 градусаў цяпла. Днём будзе 15—22 градусы вышэй за нуль.

У нядзелю, 24 жніўня, ноччу месцамі, днём на большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Днём месцамі магчымыя навальніцы. Тэмпература паветра ноччу складзе 5—12 градусаў цяпла, днём — плюс 14—20.

## Надвор'е на заўтра

| Горад | Ціск | Ноччу | Днём |
|---|---|---|---|
| МІНСК | 754 мм рт.сл. | +13..+14°C | +19..+23°C |
| ВІЦЕБСК | 753 мм рт.сл. | +13..+14°C | +16..+19°C |
| МАГІЛЁЎ | 754 мм рт.сл. | +12..+13°C | +21..+22°C |
| ГОМЕЛЬ | 756 мм рт.сл. | +14..+16°C | +23..+25°C |
| ГРОДНА | 754 мм рт.сл. | +13..+14°C | +20..+22°C |
| БРЭСТ | 755 мм рт.сл. | +12..+15°C | +24..+26°C |

Паводле даных Белгідрамета

...у суседзяў

МАСКВА +20..+21°C

С.-ПЕЦЯРБУРГ +15..+16°C

### Месяц

*Апошняя чвэрць 16.08.–22.08. Месяц у сузор'і Рака.*

### Геамагнітныя ўзрушэнні

22 гадз. 01 гадз. 04 гадз. 07 гадз. 10 гадз. 13 гадз. 16 гадз. 19 гадз.

Абазначэнні:
- — няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
- — невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
- — слабая геамагнітная бура
- — малая геамагнітная бура



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

## 19 ЖНІЎНЯ — Даты. Падзеі. Людзі




**1900** год — нарадзіўся Пётр Антонавіч Балыкоў (в. Нісімкавічы Чачэрскага раёна Гомельскай вобласці), адзін з кіраўнікоў партызанскага руху на тэрыторыі Гомельскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У пачатку вайны быў пакінуты ў тыле ворага для арганізацыі падпольнай работы. Са жніўня 1941 г. удзельнік Чачэрскага патрыятычнага падполля, быў сакратаром партгрупы ў в. Нісімкавічы. Са снежня 1941 г. — камандзір партызанскага атрада, з сакавіка 1943 г. — 1-й Гомельскай партызанскай брыгады. З верасня 1943 г. у Беларускім штабе партызанскага руху.

**1910** год — нарадзіўся Анатоль Андрэевіч Марчанкаў, удзельнік вызвалення Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1945). На фронце з 1941 г., сапёр. Вызначыўся ў 1944 г. пры вызваленні Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай абласцей: пад агнём ворага тройчы будаваў і аднаўляў пераправу праз р. Лучоса, узводзіў мост на шашы Віцебск — Орша.

У той жа дзень нарадзіўся Алесь Жаўрук (сапр. Сінічкін Аляксандр Дзмітрыевіч, г. Сянно Віцебскай вобл.), беларускі паэт. З 1939 г. ваенны карэспандэнт вайсковай газеты «У бой за радзіму». Аўтар паэтычных зборнікаў «Ручаі», «Дняпро выходзіць з берагоў», паэм «Крывёю сэрца», «Пра майго таварыша» і іншага. Напісаў лібрэта аперэты «Зарэчны барок». Загінуў у 1942 г. у баі пад Сталінградам.

**1935** год — нарадзіўся Віктар Лук'янавіч Кірычэнка, беларускі спявак, заслужаны артыст Беларусі (1968). У 1963 г. скончыў Маскоўскую кансерваторыю. З 1963 г. саліст Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларусі. Яго выкананню былі ўласцівыя музыкальнасць, тонкі лірызм. Памёр у 1974 г.




**1839** год — пад Санкт-Пецярбургам адкрыта Пулкаўская абсерваторыя.

**1945** год — у В'етнаме перамагла Жнівеньская народна-дэмакратычная рэвалюцыя, якая паклала канец манархіі і французскаму каланіяльнаму пanaванню.

**1960** год — савецкі касмічны карабель «Спадарожнік-5» з сабакамі Белкай і Стрэлкай на борце здзейсніў сутачны палёт з вяртаннем на Зямлю.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11 461. Індэкс 63850. Зак. № 1779.

Нумар падпісаны ў 19.30 18 жніўня 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12